Пралетарыі усіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.

Зьмена адрэсу: іншагародніх — 20 к. мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок шматпаразі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок шматпаразі пасьпераз тэксту 1 р. — к.
За радок шматпаразі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьвяшчэнныя на 50 проц. даражэй.
Зьмяшчэньне на 50 проц. дарожэй.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумэнт — 35 кап.
За кожны дадатковы — 15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт — 15 „
За кожны дадатковы — 5 „
Публікацыі ЗАГСу—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддаленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. аддзелах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 72 (2561) Нядзеля, 31-га сакавіка 1929 г.

Чарговы Пленум ЦКК КП(б)Бел.

скліканецца НА 5-га КРАСАВІКА 1929 г. з парадкам дня:

1. АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЧЫСТКІ САВЕЦКАГА АПАРАТУ (ДАКЛ. т. РЫСКІН).
2. АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЧЫСТКІ ПАРТЫІ. (ДАКЛ. т. ЛЯЎКОЎ).
3. БАРАЦЬБА З БЮРАКРАТЫЗМАМ І РАБОТА БЮРО СКАРГАЎ НК РСІ. (ДАКЛ. т. ЛУБУЖ).
4. РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЬЦІ І ЗНІЖЭНЬНЕ САБЕКОШТУ. (ДАКЛ. ВСНГБ І САДАКЛАД т. РАКАВА).

Старшыня ЦКК КП(б)Бел. КАЛНІН.

10 год працы Усесаюзнага Старасты.

З УСІХ ЧАСТАК САВЕЦКАГА САЮЗУ—ПРЫВІТАНЬНІ Тав. КАЛІНІНУ.

МАСКВА. 29-3. З поваду 10-годзьдзя знаходжэньня М. І. Калініна на пасадзе старшыні ЦВК і УсеЦВК ім атрыманы прывітаньні ад ЦВК БЕЛАРУСІ, МК УсеКП(б), РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ВАЙСКОВАГА САВЕТУ, БАЛТЫЦКАГА ФЛЁТУ, СНК РСФСР і іншых.

АТРЫМАНЫ ШМАТЛІКІЯ ПРЫВІТАНЬНІ АД ФАБРЫЧНА-ЗАВОДЗКІХ ПРАДПРЫЁМСТВАЎ, ВУЗ'АЎ, ГРАМАДЗКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ І ІНШ. РАБОЧЫЯ І РАБОТНІЦЫ ЗАВОДУ «КРАСНЫЙ ТРЕУГОЛЬНИК» (ЛЕНІНГРАД) ВІНШУЮЦЬ ТАВ. КАЛНІНА З 10-ГОДЗЬДЗЕМ ЯГО ДЗЕЙНАСЬЦІ НА ПАСАДЗЕ СТАРШЫНІ УсеЦВК І ЦВК СССР—ПЕРШАЕ Ў СЬВЕЦЕ ПРАЛЕТАРСКАЕ ДЗЯРЖАВЫ, ВЫКАЗВАЕ ПАЖАДАНЬНЕ БАЧЫЦЬ ТАВ. КАЛІНІНА І ЎПЕРАД БУДАЎНІКОМ САЦЫЯЛІЗМУ І БАРАЦЬБІТОМ З УЗЬНІКАЮЧЫМІ НА ШЛЯХУ ГЭТАГА БУДАЎНІЦТВА ЦЯЖКАСЬЦЯМІ.

Рабочыя і служачыя трамвайнага парку імя т. Калініна (Ленінград) пасылаюцьтав. Калініну гарачае пралетарскае прывітаньне і павіншаваньне з 10-годзьдзем знаходжэньня на адказнай пасадзе Усесаюзнага старасты.

АД ЛЕНІНГРАДСКІХ ПРАДПРЫЁМСТЎ, ЗАГАРТАВАНАГА Ў РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ БОЙКАХ ПІЦЕРСКАМУ РАБОЧАМУ, УСЕСАЮЗНАМУ СТАРАСЬЦЕ МІХАЙЛУ ІВАНАВІЧУ КАЛІНІНУ, ЯКІ СТАЎ 10 ГОД ТАМУ НАЗАД ПА ВОЛІ РАБОЧЫХ І САЛЯН СТАРШЫНЯЮ УСЕРАСЕЙСКАГА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ".

З поваду юбілею рабочыя пастанавілі адпрацаваць адзін дзень у карысьць падшэфнага сельсавету, рэалізуючы гэтым пастанову апошняй сесіі ЦВК Саюзу ССР аб узьняцьці ўраджайнасьці.

Прывітаньні прысылалі ленінградзкі дзяржаўны унівэрсытэт, усходні інстытут імя Енукідзэ, Камуністычны унівэрсытэт, вайсковa-палітычная Акадэмія імя Толмачова і іншыя навучальныя ўстановы.

Аб'яднаная школа ФЦУ і вячэрняя рабочая школа імя т. Калініна (Масква) вячэрняя школа УсеКП(б) Калінінскага землеўпарадкаўчага тэхнікуму, рабоча-сялянская моладзь, выкладчыкі і служачыя рабфаку імя тав. Калініна (Масква) пасылаюць прывітаньні Калініну і заяўляюць, што выканаюць свае задачы па выхаваньню новых кадраў рабочых і рабочай моладзі па барацьбе з расхлябанасьцю, бюракратызмам і скажэньнямі ленінскае думкі.

Рабочыя хрустальнага заводу № 7 імя т. Калініна (Масква) на лятучым мітынгу ўхвалілі рэзалюцыю, у якой, вітаючы тав. Калініна, просяць яго і ў далейшым весьці самую бязьлітасную барацьбу з тымі, хто спрабуе парушыць адзінства ў шэрагах партыі.

Атрыманы прывітаньні ад Акадэміі Навук СССР і ад Закаўкаскага крайкому УсеКП(б).

* * *

АБЛАСНЫ КАМІТЭТ УсеКП(б) паслаў М. І. Калініну наступную тэлеграму: «Міхаіл Іванавіч, Ленінградзкі абласны камітэт УсеКП(б) гарачае вітае цябе ў дзень 10-годзьдзя твайго знаходжэньня на адказнай і цяжкай пасадзе старшыні ЦВК. У тваёй асобе мы вітаем загартаванага і стойкага бальшавіка, ленінца, працоўшага цяжкі, але слаўны шлях ад заводзкага варштату праз доўгія гады рэвалюцыйнае барацьбы да кіруючае пасады ў вярхоўным органе першае ў сьвеце дзяржавы пралетарскае дыктатуры. Ан імя ленінградзкіх бальшавікоў, ад імя рабочых, работніц і ўсіх працоўных горада Леніна і вобласьці мы жадаем табе посьпеху ў тваёй карысной працы»

* * *

ЛЕНІНГРАДСКІ АБЛАСНЫ КАМІТЭТ ЛКСМ паслаў М. І. Калініну наступнае прывітаньне: «У дзень 10-годзьдзя працы тваёй на адказнай пасадзе Усесаюзнага старасты рабочая моладзь Ленінграду пасылае табе, дарагі Міхаіл Іванавіч, гарачае пралетарскае прывітаньне. На пройдзеным табою слаўным шляху бальшавіка падсольшчыка выхоўваецца шматмільённая маса маладых пралетарыяў ленінцаў.

ЛЕНІНГРАД ВІТАЕ М. І. КАЛІНІНА.

ЛЕНІНГРАД, 29-3. Сёньня на лесапільным заводзе імя т. Калініна адбыўся мітынг з поваду 10 угодкаў з дню абраньня т. Калініна старшынёю УсеЦВК. На мітынгу прысутнічалі ўсе рабочыя заводу. Ад імя рабочых заводу т. Калініну паслана прывітальная тэлеграма, у якой рабочыя вітаюць т. Калініна і пасылаюць яму сэрдэчныя пажаданьні далейшай карыснай працы. У адзнаку юбілею Усесаюзнага старасты рабочыя лесапільнага заводу пастанавілі адлічыць адзін процант ад месячнага заработку і атрыманую суму аддаць у дапамогу сялянам падшэфных вёсак і правядзеньня весьняй пасяўнай кампаніі.

* * *

ЛЕНІНГРАД. 29-3. ЛЕНІНГРАДСКІ САВЕТ паслаў М. І. Калініну наступную тэлеграму: „Гарачае пралетарскае прывітаньне старому бальшавіку - падпольшчыку, загартаванаму ў рэвалюцыйных бойках піцерскаму рабочаму, усесаюзнаму старасьце Міхаілу Іванавічу Калініну, які стаў 10 год таму назад па волі рабочых і салян старшынёю Усерасейскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту".

МГСПС тав. Калініну.

МАСКВА, 29-3. Пленум МГСПС, які зараз адбываецца, паслаў прывітаньні М. І. Калініну з поваду 10 угодкаў яго працы на пасадзе старшыні УсеЦВК і ЦВК СССР, у якім гаворыцца: Ваша праца на пасадзе кіраўніка пралетарскае дзяржавы была накіравана на ўзмацненьне дыктатуры пралетарыяту і саюзу рабочае класы з асноўнымі масамі сялянства, што забясьпечвае пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва СССР—базы міжнароднае пралетарскае рэвалюцыі. Пажадаем Вам здароўя і сілы для далейшай карыснай працы.

ВЫСТАЎКА „БАЎГАРСКІ КРЫВАВЫ ПАТОК" У БЭРЛІНЕ.

БЭРЛІН, 23-3. Учора адчынілася выстаўка «Баўгарскі крывавы паток», арганізаваная баўгарскімі палітычнымі эмігрантамі ў Нямеччыне. Выстаўка, наладжаная пры дапамозе Лігі Правоў чалавека, паставіла сваёй задачай паказаць Эўропе тыя жахі фашысцкага тэрору, якія пануюць у Баўгарыі ў працягу шэрагу гадоў.

Выстаўка адчынілася прамоваю праф. Гумбэля, якому нейкія невядомыя асобы, як відаць, агенты баўгарскага ўраду, перашкодзілі гаварыць. Аграмадны выкрываючы матар'ял, сабраны на выстаўцы, робіць страшэннае ўражаньне Сярод матар'ялу—статыстычныя табліцы, малюнкі, фатаграфіі, безьліч сьпісаў забітых барацьбітоў за рабочую справу і зьняволеных у астрогах усіх гарадоў Баўгарыі, фатаграфіі і прозьвішчы зьверскі закатаваных правадыроў рабочае клясы, журналістаў, інтэлігентаў.

Маленькая Баўгарыя, насельніцтва якое ледзь дасягае 5.000.000 налічвае больш 30.000 ахвяр фашысцкага тэрору.

СТАРШЫНЯ АНГЕЛЬСКАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ АБ АНГЛА-САВЕЦКІХ АДНОСІНАХ

МАСКВА. Старшыня прыбыўшай у Маскву ангельскай прамысловай дэлегацыі Рэмнант (галоўны рэдактар часопісі „Інгліш Рэвью") у гутарцы з супрацоўнікамі газэт паведаміў па пытаньню аб англа-савецкіх эканамічных адносінах, асьвяціўшы мэты і задачы ангельскае дэлегацыі. Задача дэлегацыі,—зазначыў Рэмнант,—знайсьці базіс для разьвіцьця гандлёвых зносін паміж Савецкім Саюзам і Вялікабрытаніяй, такі базіс, які здаволіў-бы аднолькава абодвы бакі. У сучасны момант адзінаю магчымаю формаю гандлёвых зносін зьяўляецца такая, пры якой абодвы бакі аднолькава зацікаўлены ў гандлі і атрымліваюць аднолькавую выгаду. Эканамічная структура абодвых краін зьяўляецца гарантыяй таго, што эканамічныя адносіны паміж імі могуць разьвівацца вельмі шырока. Асноўным пытаньнем, якое мае быць вырашана ангельскай прамысловай дэлегацыяй сумесна з савецкімігаспадарцамі зьяўляецца пытаньне аб тых умовах, пры якіх могуць быць утвораны зьдзелкі. Спрыяючыя фактары вырашэньня пытаньня аб умовах ужо маюцца. Арганізуючы дэлегацыю, яе ініцыятары з самага-ж пачатку былі пераканаты, што натуральныя багацьці Савецкага Саюзу, яго прызьвычаенае да працы шматмільённае насельніцтва з аднаго боку і фінансавая прамысловая магутнасьць Вялікабрытаніі—з другога боку—зьяўляецца парукаю пасьпяховага вырашэньня пытаньня аб умовах гандлёвых зьдзелак. Перад выездам з Англіі ў СССР я паведаміў друку даныя аб тым, што дэлегацыя прадстаўляе 150 фірм, уладаючых у агульным ліку капіталам у 250 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. Магу дадаць, што па высьветленых апошніх даных лік фірм, прадстаўленых членамі ангельскае прамысловае дэлегацыі, дасягае 500, гэтыя 500 фірм прадстаўляюць капітал прыблізна ў суме 500 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў.

У заключэньне Рэмнант адзначыў, што ангельскія прамысловыя колы, меўшыя справу з Савецкім Саюзам, у апошнія гады пераканаліся, што савецкія арганізацыі, ажыцьцяўляючыя замежны гандаль Савецкага Саюзу, добра і акуратна выконваюць прынятыя імі на сябе абавязацельствы. Гэткае пераканаьне, пануючае сярод ангельскіх прамыслоўцаў, зьяўляецца бясспрэчна спрыяючым фактарам для далейшага разьвіцьця англа-савецкіх адносін.

СССР—галоўны козыр на парляманцкіх выбарах.

ВАРШАВА, 29-III. Орган польскае партыі працы (група Крука) штотыднёвік «Пшэдвёсно» друкуе сэрыю заяў кіраўнікоў ангельскае рабочае партыі адносна замежна-палітычнага пункту, якога будзе прытрымлівацца рабочая партыя ў выпадку сваёй перамогі на кадыходзячых выбарах.

ДЖОРДЖ ЛЕНСБЭРЫ заяўляе, што калі зьявіцца неабходнасьць, ангельская рабочая кляса здолее перашкодзіць кансэрватарам выступіць вайной супроць СССР. Лексбэры заяўляе, што пасьля выбараў у Англіі англа-савецкія дачыненьні будуць адноўлены, бо «нашы расейскія прыяцелі адчуваюць у нас патрэбу, а мы ў іх». Лепшай гарантыяй свабоды для Польшчы, а таксама для Латвіі, Літвы і Эстоніі зьяўляецца, водаўг слоў Ленсбэры, утрываленьне савецкага рэжыму.

Савецкі ўрад,—заяўляе ПАНСОНБІ, даказаў, што ён шчыра імкнецца да разброеньня. БРАКУЭЙ (лідэр незалежнае рабочае партыі) падкрэсьлівае небясьпеку нападу капіталістычных дзяржаў на СССР. Прыязьнь з СССР будзе адным з галоўных лёзунгаў рабочае партыі ў прадвыбарчай кампаніі. Старшыня ангельскага саюзу пацыфістаў лёрд ТЭВІСОН выказвае задаволеньне наконт падпісаньня маскоўскага пратаколу. Па яго думцы, ангельскія кансэрватары, якіх ён называе «ворагамі чалавецтва» ня здольны весьці мірную палітыку. Рэдакцыя штотыднёвіка паведамляе, што ў наступным нумары будуць надрукаваны заявы шэрагу іншых дзевячох ангельскае рабочае партыі, у тым ліку Пэрсэля, Бэн-Тылека, Элен Фількінсон і інш.

Шатляндзкія гарнякі ўтвараюць новы рэвалюцыйны саюз.

ЛЕНДАН, 22-3. Выключэньне з лінкашырскага саюзу гарнякоў Візьляма Аллана і іншых камуністаў выклікала коцнае абурэньне шатляндзкіх гарнякоў. У цэлым шэрагу мясцовасьцяй гарнякі адкаўляцца ад выплаты сяброўскіх узносаў і масамі выходзяць з саюзу.

Пры такіх акалічнасьцях рэвалюцыйныя лідэры, не дачакаўшыся красавікоўскае канфэрэнцыі, якая склікаецца для арганізацыі новага адзінага рэвалюцыйнага саюзу горнарабочых Шатляндыі распачалі заснаваньне мясцовых ячэек новага саюзу і разьмеркаваньне членскіх білетаў. Такія мясцовыя арганізацыі ўтвараюцца ў Старлінгшыры, Лінкашыры, Вэст-Лётьянсе і Файфшыры. Аднак у Файфшыры становішча ўскладняецца тым, што некаторыя члены савету выключанага з шатляндзкае федэрацыі Файфскага саюзу ня спыняюць захоўваць ілюзіі ў адносіне да рэфармістаў і нацыянальнае федэрацыі горнарабочых. Яны думаюць, што камісія нацыянальнае федэрацыі, якая абсьледавала становішча ў шатляндзкіх арганізацыях, выкажацца ў іх карысьць і аддасьць перавагу таму, што да пастановы камісіі ня прыйдзе ніякіх мер па арганізацыі новага саюзу.

Орган кампартыі „Уокерс Лайф" абмяркоўваючы становішча ў Файфэ зазначае, што палітыка нацыянальнае федэрацыі гарнякоў накіравана выключна на выключэньне з саюзу рэвалюцыйных элементаў. „Вагацца ў гэтых умовах, значыць граць на руку рэфармістам. Файфская арганізацыя таксама, як і Старлінгшырская, Лянкашырская і інш. павінна ўсе свае сілы неадкладна кінуць на ўтварэньне адзінае рэвалюцыйнае арганізацыі".

Рабочы рух у Палестыне.

ЯФФА. У апошні час у Палестыне адбываецца шэраг забастовак. У Хайфе бастуюць рабочыя мэталёвага заводу, а ў Ерусаліме рабочыя друкарні Вэйса. Барацьба з рабочым рухам вядзецца па ўсяму фронту. З аднаго боку рэвізіяністы ўзялі на сябе ролю дабрахвотных паліцэйскіх і робяць вобыскі, канфіскацыі і зьбіваюць левых рабочых.

У мэтах барацьбы з левым крылом у прафсаюзах рэвізіяністы арганізуюць рабочых пад фашысцкімі лёзунгамі „за клясавы мір, за нацыянальную салідарнасьць, за рэлігію». Гэтыя арганізацыі зрываюць забастоўкі, зьбіваюць рабочых, тэрарызуюць іх.

У мінулы тыдзень у яфскай турме адбывалася арганізаванае катаваньне (трэцяе за апошнія два месяцы) арыштаваных. Камэндант і астрожная варта патрабавалі ад зьняволеных, каб тыя сталі перад імі на каленкі. На катэгарычны адказ дабрахвотна падпарадкавацца гэтаму зьдзеку, астрожная варта накінулася на арыштаваных і зьбівала іх да таго, пакуль яны ня страцілі прытомнасьці. Адна з ахвяр зьбіваньняў у цяжкім стане знаходзіцца ў шпіталі.

Зьбіваньне фашыстамі францускіх дэпутатаў.

ПАРЫЖ, 29-3. Абгрунтоўваючы тэрміновасьць свайго допыту аб інцыдэнце на пахаваньні Фоша, сацыяліст Уры заявіў: «Інцыдэнт, які абярнуўся ў фашысцкую дэманстрацыю супроць ураду, адбываўся побач са зьнявагаю і зьбіваньнем асобных дэпутатаў, незалежна ад іх партыйнае прыналежнасьці. Гэтая дэманстрацыя была арганізавана Каты. Урад ня ўжыў ніякіх захадаў для абароны рэспубліканскага ладу, а паліцыя спакойна прысутнічала ў часе выказваньня зьнявагі парляманту".

Міністр унутраных спраў Тарт'е заявіў, што бярэ на сябе поўную адказнасьць за ўчынкі паліцыі. Водаўг прапановы ўраду, палата адклала абмеркаваньне допыту Уры на пяцёўны тэрмін.

Міжрабпом—баявая арганізацыя дапамогі.

БЭРЛІН, 29-3. Учора ў Дрэздэне адчыніўся зьезд нямецкае сэкцыі Міжрабпому. У той-жа дзень у Бэрліне адчынілася сэсія Цэнтральнага Камітэту Міжрабпому, у якой удзельнічалі прадстаўнікі Францыі, Англіі, Бэльгіі, Галяндыі, Чэха-Славакіі, Скандынавіі, Аўстрыі, Балканскіх краін, СССР і Амэрыкі. Сярод дэлегатаў было шмат вядомых дзеячоў рабочага руху.

Сэсія сьцьвердзіла вялікія посьпехі Міжрабпому ў міжнародным маштабе, асабліва на Балканах, у Чэха-Славакіі, Англіі, Мэксыцы і Злучаных Штатах. Посьпехі Міжрабпому, які аб'яднае 18 мілёнаў чалавек, зрабілі яго аб'ектам суровых нападак з боку буржуазеі і сацыял-дэмакратыі, а ў апошні час таксама і з боку групы Брандлера. Ня гледзячы на гэтае цкаваньне, ніхто з шматлікіх прыяцеляў Міжрабпому некамуністаў, як напрыклад праф. Эйнштэйн, Елена Штэкер і інш. справе Міжрабпому ня здрадзілі.

Генэральны сэкратар Міжрабпому Мюнцэнбэрг сьцьвярджае на старонках „Ротэ Фанэ", што падтрыманьне, якое аказваў Міжрабпом дэкаўтаваным мэталістам Руру і рабочым гамбурскіх вэрфяў, прыцягнула ў яго шэрагі шмат тысяч новых членаў і прыяцеляў і абярнула Міжрабпом у сапраўдную баявую пралетарскую арганізацыю дапамогі. „Недарма піша Мюнцэнбэрг,—буржуазея патрабуе, каб супроць Міжрабпому былі прыняты паліцэйскія меры".

„Удава князя" Паўла засталася ні пры чым.

ЛЁНДАН, 27-III. Апэляцыйны суд разглядаў справу па іску Вольгі Алей (удава ранейшага вялікага князя Паўла Аляксандравіча) да Норману Вэйсу, які набыў у ленінградзкім аддзяленьні Дзяржгандлю мэблю, малюнкі і інш. з ранейшага палацу Алей. Суд у першай інстанцыі, які разглядаў справу ў лістападзе леташняга году, адмовіў у іску. Апэляцыйны суд зацьвердзіў гэтую пастанову суду ў першай інстанцыі.

Пытаньне аб звароце белаэмігрантаў у СССР.

ВЕНА, 23-3. Група расейскіх белаэмігрантаў, якія пражываюць у Баўгарыі, зьвярнулася ў Лігу правоў чалавека з просьбай дапамагчы ім вярнуцца ў СССР. «Работническо дело» паведамляе, што і іншыя расейскія эмігранты выказалі жаданьне вярнуцца ў Савецкі Саюз, але белагвардзейцы, як і Ліга правоў чалавека розным чынам ім у гэтым перашкаджаюць. Газэта патрабуе, каб баўгарскі ўрад пачаў перамовы з СССР і палегчыў жадаючым магчымасьць вярнуцца на бацькаўшчыну. (ТАСС).

15 КРАСАВІКА ПАЧНЕЦЦА РЭАЛІЗАЦЫЯ НОВАЙ ПАЗЫКІ.

Урад СССР выдаў пастанову аб выпуску новай бясспроцантнай выйгрышнай пазыкі 1929 г. на суму 50000000 руб. Нашаму супрацоўніку ў наркамфіне БССР паведамілі, што рэалізацыя пазыкі пачнецца з 15 красавіка і будзе праводзіцца да 29 чэрвеня. Рэалізацыя новай пазыкі 1929 г. будзе праводзіцца выключна за налічны разрахунак. Пры гэтым неабходна зазначыць, што з 15 да 24 красавіка аблігацыі пазыкі будуць прадавацца па льготнаму (выпускному) курсу—98 р. за 100 руб. аблігацыю і 49 руб. за палову яе. З 25-га красавіка да 14 мая продаж аблігацый будзе праводзіцца па справачнай цане, а з 15 мая пазыка ўжо ўваходзіць у каціроўку і будзе прадавацца па біржавым курсу.

Першы тыраж выйгрышаў па новай пазыцы адбудзецца 30 чэрвеня бягучага году; у тыражы будзе разыграна 5600 выйгрышаў на суму 1053100 руб.

Новая пазыка, галоўным чынам, разьлічана на прыватны сэктар, а таксама на асоб, якія атрымоўваюць высокую заработную плату. Рэалізацыя пазыкі будзе праводзіцца не ў парадку масавай кампаніі, а шляхам банкаўскіх апэрацый праз усе крэдытныя ўстановы і касы ашчаднасьці.

У Саюзе ССР.

БОЛЬШ УВАГІ ТЭХНІЦЫ БЕЗАПАСНАСЬЦІ НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ ДАНБАСУ.

МАСКВА, 30-3. Прэзыдыум УсеЦСПС, заслухаўшы даклад т. Угланава, старшыні камісіі Савету Працы і Абароны, якая выяжджала ў Данбас, канстатаваў вельмі няўважлівыя адносіны гаспадарчых органаў і органаў Наркампрацы ў тэхніцы безапаснасьці.

ВСНГ СССР прапанаваў прыняць рашучыя меры да ўзмацненьня унутрыгаспадарчага нагляду ў галіне тэхнікі безапаснасьці, Наркампрацы СССР даручана пераглядзець заканадаўства па тэхніцы безапаснасьці, асабліва па гарняцкай прамысловасьці. Апроч таго, прапанавана Наркампрацы СССР сумесна з АТЭ УсеЦСПС распрацаваць пытаньне аб павялічэньні складу тэхнічнай інспэкцыі, асабліва горна-тэхнічнай. Прэзыдыум УсеЦСПС прызнаў таксама неабходным прапанаваць Наркампрацы і НК РСІ СССР арганізаваць пры ўдзеле ЦК саюзу гарнякоў абсьледаваньне стану тэхнікі безапаснасьці ў агульнай прамысловасьці. У галіне бытавога абслугоўваньня рабочых Данбасу, прэзыдыум УсеЦСПС настаяваў настаіваць перад Наркамгандлем аб узмацненьні дастаўкі Данбасу прадуктаў шырокага ўжываньня, прапанаваць ВСНГ СССР паскорыць выдачу Гарлоўскаму рудаўпраўленьню прысуджанае яму па конкурсу прэміі ў 968.000 руб. для правядзеньня шырокага культурна-бытавых мерапрыемстваў, даручыць ЦК саюзу гарнякоў дабіцца пашырэньня ўстаноў культурна-бытавога характару і ўзмацніць правядзеньне дырэктывы аб устанаўленьні 6-гадзіннага рабочага дня для падземных рабочых.

Дэлегацыя сялян у НК Гандлю СССР.

МАСКВА, 28-3. 28-га сакавіка ўвечары НК Гандлю СССР наведала дэлегацыя сялян розных паветаў Маскоўскае губэрні ў колькасьці 92 чалавек. Дэлегацыя прыбыла з мэтаю азнаёміцца з працай НК Гандлю ў галіне рэгуляваньня загатовак сельскагаспадарчых тавараў і дастаўкі па вёску прамысловых тавараў. Дэлегацыю прыняў Намесьнік НК Гандлю СССР т. Максімаў, коратка абмалёўваўшы задачы НК Гандлю ў галіне ўнутранага і замежнага гандлю. У гутарцы з дэлегацыяй Максімаў адказаў на шэраг запытаньняў. Гутарка цягнулася звыш 4 гадзін.

Рашучая барацьба супроць прагульшчыкаў.

СТАЛІН, 28-3. Капальні Сталінскага кіраўніцтва капальняў за апошніх 5 месяцаў з прычыны прагулаў і тэхнічных прычын по дадалі 40 тысяч тон вугалю. На сходзе, які адбыўся, рабочыя патрабавалі ўжыць суровыя меры супроць прагульшчыкаў. Камсамольцы арганізуюць ударныя брыгады і конкурс на лепшага рабочага. Паміж асобных капальняў распачата выпярэдніцтва па павышэньне здабычы і зьніжэньне сабекошту. Вялікія дасягненьні ў гэтым напрамку маюцца на капальні „Ветка", дзе выканана 106 проц. праграмы здабычы.

Кантрактацыя бавоўны ў Узьбекістане.

САМАРКАНД, 28-3. Ва ўсім Узьбекістане пачалася кантрактацыя баваўняных пасеваў. Сёлета бавоўны будзе засеена 730.000 гэктараў—на 16 пр. больш мінулагодняга. Кантрактацыя бавоўны пачата ў бягучую пасеўную кампанію на 15 дзён раней, чымся ў мінулым сэзоне. Упяршыню ў відзе опыту ўведзена дыферэнцыяцыя авансаваньня ў залежнасьці ад сацыяльнага становішча асоб, атрымліваючых аванс.

У мэтах падахвочваньня бавоўнаводства, будзе выдавец ад сельска-гаспадарчага падатку на два гады ўлік прырост баваўняных плошчаў у бяднацкіх і серадняцкіх гаспадарках.

Пасылка жанчын на курсы.

ЦК УсеКП(б) прапанаваў у будучы набор на цэнтральныя курсы камсамольскіх працаўнікоў пры курсах марксызму прыняць ня менш 30 пр. дзяўчат. Такі-ж процант павінен быць устаноўлен і для аднагадовых курсаў працаўнікоў пры менскім і ленінградзкім камвузах. Адначасова ЦК прызнаў магчымым правесьці мабілізацыю дзяўчат з ліку актыву на вучобу ў вячэрнія камвузы з вызваленьнем іх на час вучобы ад іншых нагрузак.

ФІНІШ АЭРАСАННАГА ПРАБЕГУ.

МАСКВА, 29-3. Учора а 5 гадзіне дню адбыўся фініш усесаюзнага аэрасаннага прабегу. Фініш прыцягнуў шмат працоўных, ператварыўшыся ў шырокае ўшанаваньне адважных удзельнікаў прабегу і канструктараў аэрасанак, блескуча вытрымаўшых на гэты раз самае цяжкае з выпрабаваньняў. А 6 гадзіне вечара сустракаемыя авацыямі пад гукі аркестру, на поўным ходу падыходзяць да фінішу двое аэрасанак Цагі і адна аэрасанкі Намі. Камандор прабегу т. А. М. Разанаў рапартуе старшыні аэрасаннага прабегу т. В. І. Баранаву. Пасьля гэтага т. Баранаў, Асінскі, Фэльдман і іншыя вітаюць важакоў, механікаў і карэспандэнтаў, удзельнічаўшых у прабегу. Рабочыя і чырвонаармейцы наладжваюць авацыю вылазячым з машын, змораным і абветраным важакам. Іх ускідаюць на рукі і качаюць.

У ЛІТВЕ.

ЗАКОН АБ ПРЫМАЦАВАНЬНІ БАТРАКОЎ.

КОЎНЯ, 22-3. Водаўг паведамленьняў газэт, літоўскае міністэрства земляробства выпрацоўвае закон, які забараняе парабкам пакідаць наймацеля раней вызначанага тэрміну. Гэты закон аб прымацаваньні батракоў да таго рэакцыйны, што нават «Дарбо Фэдэрацыя» (жоўты каталіцкі друк) зазначае, што гэты закон ставіць батракоў у становішча нявольнікаў. (ТАСС).

ПРАЦЭС ПОЛЬСКІХ ШПІЁНАЎ У КОЎНІ.

25 сакавіка ў Коўні адбыўся суд над 6 палякамі, абвінавачанымі ў шпіянажы ў карысьць Польшчы. Згодна акту абвінавачаньня гэтыя 6 асоб складалі арганізацыю, падтрымліваючую сувязь з Польшчаю і дастаўляючую туды ўсялякія весткі аб дыслёкацыі і перасоўваньню войска і г. д.

Пры адным з іх знойдзен ліст афіцэра корпусу прыгранічнае варты аб высылцы яму 100 даляраў і з напрокамі, што ён не пасылае інфармацыі.

Ковенскі суд прыгаварыў 3-х з абвінавачаных да 8, 5 і 4 год турмы.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Кветка польскае дэмакратыі.

Дэпутат сойму Вінярскі за дзень да роспуску сойму агаласіў загад прыморскага ваяводы наступнага зьместу:

На падставе дэкрэту міністэрства ўнутраных спраў прапануецца правесьці пэрсанальную рэгістрацыю ўсіх асоб, якія выказваюць актыўнасьць палітычную ці грамадзкую.

Пры правядзеньні рэгістрацыі неабходна прытрымліваецца наступных правіл:

1) Праводзімай рэгістрацыяй павінны быць ахоплены ня толькі тыя асобы, якія зьяўляюцца ўдзельнікамі легальных арганізацый палітычных ці грамадзянскіх, але і тыя асобы, якія не належаць ні да якіх арганізацый, але маюць уплыў на грамадзкую думку.

2) Рэгістрацыя будзе праводзіцца па сыстэме карткавай, і на кожную асобу, ахопленую рэгістрацыяй, будзе рабіцца галоўная і дадатковая картка.

3) У выпадку, калі які небудзь палітычны, ці грамадзкі дзеяч пераяжджае з аднае акругі ў другую, адміністрацыя павінна перасылаць карткі на яго (галоўную, а па меры патрэбы і дадатковую) адміністрацыі тае акругі, дзе асоба будзе жыць.

Польскія газэты паведамляюць, што дэкрэт міністэрства быў выдадзен 26 лістапада леташняга году, а 26 лютага міністэрства разаслала інструкцыйны ліст да дэкрэту.

Курс польскай пазыкі зноў падае.

Водаўг паведамленьня польскіх газэт на амэрыканскай біржы курс польскай стабілізаванай пазыкі зноў зьнізіўся. Некалькі дзён таму назад ён каціраваўся ў 85,5 даляраў, учора-ж зьнізіўся да 84,5 даляраў.

У палітычных колах гэта зьніжэньне тлумачыцца ўражаньнем, якое зрабілі апошнія пасяджэньні і абставіны, пры якіх сойм быў распушчан.

Галадоўка палітычных вязьняў у Вільні.

ВАРША'ВА, 20-3. З Вільні паведамляюць, што палітычныя зьняволеныя абвясьцілі галадоўку, высунуўшы наступныя патрабаваньні: павялічыць час прагулак і дазволіць чытаньне газэт.

ПАСЬЛЯ ЗЬЕЗДУ ГАМІНДАНУ.

Ня гледзячы на яшчэ ня зусім дастатковую інфармацыю ад толькі што скончыўшымся 3-м зьезьдзе Гаміндану, нават тыя даныя, якія маюцца, дазваляюць завяраць: кітайскі фэадальна-буржуазны блёк перажывае рашучы крызіс. Толькі нядаўна сьпешна арганізаваны пад націскам спалоху перад паўстаўшымі рабоча-сялянскімі масамі, гэты блёк ужо супольна выкрыў супярэчнасьць інтарэсаў складаючых яго клясаў, клясавых праслоек і груп. Спроба „дзяржаўнага будаўніцтва", перш за ўсё спроба «аб'яднаньня краіны» сіламі фэадальна-буржуазнага блёку, на чале з разнакаляровым Гаміндамам, церпіць крах. Маркуючы па рэзалюцыі зьезду, мы прысутнічаем зараз пры новай спробе, але ўжо ня блёку, а яго буржуазнае часткі ў саюзе з чужаземным імпэрыялізмам „аб'яднаць" краіну моцаю зброі.

Недарма ў адной з асноўных рэзалюцый зьезду барацьба з імпэрыялізмам адкрыта адсоўваецца на другі плян пібы з прычыны канцэнтраваць усе сілы на лініі краіны, цэнтралізацыі фінансаў і г. д. Тэатральна-ліберальныя гэсты Чан-Кай-шы на зьезьдзе Гаміндану і яго клятвы вернасьці «народным інтарэсам» ня могуць замазаць таго асноўнага факту, што гаміндаўцы ня толькі ня здольны аб'яднаць Кітай і вызваліць яго ад ярма імпэрыялізму, але не жадаюць весьці барацьбу з імпэрыялістамі.

Перад намі такія поўныя вусім канкрэтныя факты, як згода з Японіяй шляхам уступак з боку Нанкіну, згортваньне антыімпэрыялістычнае барацьбы і поўзаньне Чан-Кай-шы перад амэрыканскімі капіталістамі. Яшчэ зусім нядаўна адзін з кіраўнікоў нанкінскае верхавіны Ху-Хан-

АЧЫСЬЦІМ НАШ АПАРАТ АД ВАРОЖЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ.

За безадкладную падрыхтоўку да чысткі.

(З дакладу Нам. Нар. Каміс. РСІ т. Рыскіна на прэзыдыуме ЦСПСБ).

Прэзыдыум ЦСПСБ на сваім апошнім пасяджэньні ўсебакова абгаварыў даклад Намесьніка Нар. Кам. РСІ БССР. т. Рыскіна аб парадку праведзеньня чысткі савецкага апарату і ўдзеле прафсаюзнай масы ў гэтай працы.

— Мэтазгоднасьць і неабходнасьць чысткі савецкага апарату,—кажа тав. Рыскін,—ясна для ўсіх і прызнана ўсімі.

Спачатку мы меркавалі пачаць чыстку з 15 красавіка, але мы лічым, што сьпяшацца ў такой важнай справе нельга і трэба да праведзеньня чысткі добра падрыхтавацца.

Зараз ужо ёсьць пастанова ЦКК НКРСІ, наводле якой мы мяркуем пры ступіць да чысткі з 1 мая.

Чыстка апарату будзе генэральнай, яна сабой ахопіць як савецкія, гаспадарчыя, так каапэрацыйныя апараты зьверху да нізу. Каб бяз усялякіх перапынкаў правесьці чыстку, мы ўстанавілі чарговасьць, намі вызначан парадак, у якім будзе праводзіцца праца па асобных ведамствах і арганізацыях.

Генэральная чыстка павінна прывесьці да аздараўленьня ўсяго нашага апарату. Яна павінна аслабаніць увесь апарат ад чуждых элемэнтаў і ўсіх разлажыўшыхся.

Да першай катэгорыі мы адносім былых паноў, фабрыкантаў, былых царскіх чыноўнікаў, якія вялі барацьбу з рэвалюцыйным рухам і іншых былых людзей. Да другой катэгорыі—усіх тых, хто сваёй працай прыносіць шкоду савецкай уладзе або дыскрэдытуе яе,—разлажыўшыхся элемэнтаў.

Калі да чысткі апарату падыходзіць фармальна, з пункту погляду клясавай нянавісьці—гэта будзе няправільна. Чыстка апарату павінна праходзіць пад знакам рэвалюцыйнай катэгорыі. Напрыклад, калі былы царскі афіцэр усю грамадзянскую вайну разам з намі праводзіў у барацьбе з белымі арміямі, калі ён сваёй працай даказаў сваю адданасьць уладзе рабочых і сялян, калі ён працуе добра і прыносіць нам карысьць, дык ён можа і надалей працаваць і рабіць нашу агульную справу. Трэба не захапляцца колькасьцю ачышчаемых, а дабівацца аслабаненьня нашага апарату ад варожых і разлажыўшыхся элемэнтаў і аздаравіць яго.

Чысьціць апарат трэба будзе незалежна ад сацыяльнага паходжэньня, калі, калі працаўнік таго ці іншага апарату былы рабочы і ён разлажыўся і сваёй працай прыносіць нам шкоду, дык яго бязумоўна трэба вычысьціць.

Пры чыстцы апарату нам патрэбны будуць ня толькі хірургічныя, але і прафілактычныя меры. Апошнія меры мы будзем прымяняць да сацыяльна блізкіх нам людзей, якія крыху абюракраціліся і г. д., але няма дастатковых прычын да іх чысткі.

Такіх людзей мы будзем выпраўляць, перавыхоўваць шляхам грамадзкай ганьбы, перакідкі на другую працу і г. д.

Пытаньне мэтаду праведзеньня чысткі—вельмі важнае пытаньне. Чыстка апарату ў нас праводзілася ня раз, але яна насіла скрыты характар. Сучасная генэральная чыстка павінна насіць адчынены характар, да яе праведзеньня мы павінны прыцягнуць шырокую грамадзкасьць, мы павінны ў чыстку апарату ўцягнуць шырокія масы рабочых.

Каб на пытаньні чысткі апарату ўтварыць грамадзкую думку, трэба разьвіць вялікую і энэргічную кампанію ў друку, трэба гэтае пытаньне папулярызаваць на масавых сходах рабочых.

На мясцох ужо ўтвораны камісіі садзейнічаньня, якія заняты падрыхтоўкай матар'ялу ў сваіх установах. Утвараюцца таксама рабочыя брыгады, якія абіраюцца на агульных сходах рабочых. Рабочыя ад варштату—вось той атрад, які павінен будзе актыўна дапамагаць нам у праведзеньні гэтай вельмі важнай працы.

Сам працэс праверкі будзе праходзіць такім чынам, што ўвесь сабраны матар'ял будзе прапрацоўвацца і абгаварвацца на шырокіх адчыненых сходах працаўнікоў. Фармальна праца па праведзеньню чысткі будзе праводзіцца РСІ, але фактычна ўся гэта праца павінна быць праароблена ў масавым парадку з самым шырокім прыцягненьнем рабочых і наогул працоўных.

Чыстка напэўне закране досыць значную колькасьць працаўнікоў, а ў тым ліку напэўна і такіх, якія займаюць кіруючыя гаспадарчыя і адміністрацыйныя пасады. А таму перад саюзамі ва ўсю шырыню паўстае пытаньне аб вылучэньні. Трэба ў працягу бліжэйшых месяцаў знайсьці кім замяніць вычышчаных, трэба арабочыць апарат у парадку вылучэньня.

Трэба таксама прадугледзець, каб ня даць магчымасьці ў далейшым засьмячаць нашаму апарату. Тут трэба падумаць аб некаторых зьменах у заканадаўстве аб працы. Тых, якіх па чыстцы мы звольнім бяз права паступленьня, неабходна будзе да іх прымяніць таксама адпаведныя меры і па саюзнай лініі.

У спрэчках па дакладу тав. Рыскіна выступіла шэраг таварышоў. Тав. Каплан гаворыць, што пакуль праца ідзе толькі ў сьценах РСІ. Трэба гэту вельмі важную працу вынесьці ў шырокія масы працоўных. Навакол пытаньня чысткі апарату неабходна ўтварыць грамадзкую думку. Прафсаюзам трэба будзе ўдзяліць самую сур'ёзную ўвагу пытаньню ўтварэньня камісій садзейнічаньня і рабочых брыгад. Трэба саюзам сур'ёзна падумаць аб падрыхтоўцы кадраў для вылучэньня рабочых для працы ў апараце.

Тав. Жылюк прыводзіць факт, калі гэтымі днямі ў адной з менскіх школ з спэцклясаў выпусьцілі 60 проц. дзяцей кулакоў і нэпманаў, сярод якіх арганізавалася група, якая выкінула антысавецкі лёзунг. Між тым праз некалькі дзён іх усіх накіроўваюць для працы ў вясковы каапэрацыйны апарат. РСІ неабходна зірнуць сваім вокам, што робіцца ў нашых прафспэцклясах і каго яны рыхтуюць.

Старшыня ЦСПСБ тав. Рыжоў знаходзіць, што пры дапамозе камісій садзейнічаньня і рабочых брыгад мы бязумоўна ачысьцім нашы апараты ад усяго нам шкоднага. Сярод справаводаў у нас ёсьць досыць былых людзей, якія прыносяць нам шмат шкоды. Калі мы капнём гандлёвы апарат, дык тут хопіць розных спэкулянтаў, якія для нас загатаўліваюць 100 пуд., а на прыватны рынак 200-300. Саюзам трэба сур'ёзна падумаць, каб падрыхтаваць добрую зьмену на месца вычашчаных. Нам не адзін рабочы будзе патрэбен у галоўку нашых устаноў, бо дзе-ні-дзе знойдуцца і разлажыўшыяся адміністратары і гаспадарнікі. Саюзам трэба загадзя падумаць кім замяніць і падрыхтаваць.

Тав. Войтэнка зазначае, што рыхтавацца да праведзеньня кампаніі мы заўсёды пачынаем у разгары кампаніі. Наш апарат зараз працуе дзень і ноч, а над чым ён працуе? Працаўнікі апарату зьбіраюць спраўкі ледзь ня з дню нараджэньня. У газэтах, кажа т. Войтэнка, часам зьяўляецца цэлы букет былых і варожых нам людзей у апаратах, аж жах бярэ, як прачытаеш. Глядзіш праз некалькі дзён бюро дасьледваньня той-жа газэты дае абвяржэньне. У час чысткі апарату такімі рэчамі жартаваць нельга. Па Наркамзему гэтыя абвяржэньні бюро дасьледваньня дае цэлымі пачкамі, неабходна да гэтага пытаньня падыходзіць больш сур'ёзна. Саюзы вельмі слаба падрыхтаваны да вылучэньня, але нават калі і вылучаем, дык мы не аказваем дапамогі ў працы вылучэнцу.

Нар. Кам. Працы т. Бэнэ гаворыць, што ў нашых апаратах ёсьць цэлы шэраг пасад, якія можа замяніць пісьменны чалавек. Канцэлярскіх працаўнікоў нам для замены хопіць. Асабліва востра трэба паставіць пытаньне аб падрыхтоўцы працаўнікоў для гандлёвага апарату. Трэба арганізаваць курсы для падрыхтоўкі па шэрагу спэцыяльнасьцяў.

Пасьля заключнага слова т. Рыскіна прэзыдыум ЦСПСБ згадзіўся з устаноўкай РСІ ў парадку чысткі апарату і прыняў шэраг пастаноў, якія даручыў канчаткова апрацаваць спэцыяльна вылучанай камісіі. У цэнтральную камісію па чысткі апарату прэзыдыум вылучыў т. Кулака і яго намесьнікам т. Гіляжевіча, а ў акруговую—т. Ісаева і намесьнікам яму т. Кавалёва.

Бюракрат Мохаў адпачывае на дырэктывах РСІ.

У мінулым годзе Полацкая РСІ-КК рабіла абсьледваньне канторы Фанэра-Дзьвіналесу, дзе было выяўлена шэраг недахватаў: пратэкцыянізм, кумаўство, невыкананьне дырэктыў ураду аб зьніжэньні адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў і засьмечанасьці апарату чуждым элемэнтам.

РСІ-КК дала шэраг дырэктыў, каб зьнішчыць хваробныя зьявішчы ў працы канторы. Але загадчык Мохаў амальшто не зьвяртаў ніякай увагі на заўважаньні АКК-РСІ.

Наём рабочай сілы на лесараспрацоўках, пагрузках, пастаўках робіцца без належнага клясавага падыходу. Рабочаю сілаю тут у сваёй большасьці зьяўляюцца сяляне, прычым пры прыёме на працу перавага аддаецца кулацкім элемэнтам, а беднякі застаюцца бяз працы.

Напрыклад, у Дрысенскім раёне беднякі не атрымалі работы толькі таму, што ня былі добра знаёмы з дзесятнікамі. Нарэшце работа была аддадзена кулакам і заможнікам, а 140 беднякоў засталіся ніпрычым. Адміністратары заключылі дагавор з кулацкай арцельлю, якая потым увесь час мела значныя прыбыткі ад «дабрадзейных» адміністратараў.

Пры абсьледваньні канторы, РСІ прапанавала, каб Мохаў зьняў з працы прынятых цераз пратэкцыянізм Фактаровіча, Мееровіча, Рапапорта, Нэйштата і Гурэвіча—дзесятнікаў і прарабаў. Але паказаныя асобы да гэтага часу знаходзяцца на сваіх ранейшых пасадах.

У Заскарскім сельсавеце, Ветрынскага раёну, працуе дзесятнік Фанэра-Дзьвіналесу Дапіліп, які беднякоў называе «лодырамі, лежабокамі, хамамі», а на працу прымае тых асоб, якія маюць добрыя заможныя, нават кулацкія гаспадаркі.

На ст. Фарынава дзякуючы «добраму» дзесятніку, некаторыя падрадчыкі шляхам экспляатацыі насельніцтва «зашыбаюць» грошыкі.

Полацкая РСІ павінна зрабіць генэральную чыстку ня толькі візавога апарату Фанэра-Дзьвіналесу, але і адміністрацыйнага апарату канторы.

Андрэй Дудка.

Ліхаманкавы калаўрот.

Пілі, елі, закусвалі. І за маладую княгіню з маладым князем, і за братоў з сёстрамі, і за кумоў з свацьцямі. Не запамятавалі і здароў'е будучых дзяцей, і парсючкоў, якія бязумоўна павінны быць у гаспадарцы. На кожны кілішак прыдумвалі тосты, а да кожнага тосту бясплатнай прэміяй накладваўся кілішак. Адным словам, як казаў адзін дзівак,—«па барадзе цякло—у рот не папала, у рот папала—па барадзе не цякло». Хлебнага віна саматужнай вытворчасьці, прыпраўленага дурнап'янам у струшанку з самасейкай, гасьцям хапала.

Здавалася, што хата перакручваецца ўніз страхою, а людзі ходзяць уверх нагамі, як у той Амэрыцы, што апавядаў Тарас «Кажынялжы». П'янае рэзнагалосьце ўзяло ў плен гасьцей, адарвала ад зямной сумятні, узьняло ў паднябесны эфір. І пад казытаючавясёлы матыў «лявоніхі» госьці кружыліся ў старадаўняй „мяцеліцы". Кума Марына—два мэтры ў радыусе,—выстуквала кадрыль, успамінаючы дзявочыя гады, калі яна ганяла кароў на паранкі і гарэзьліва крычала ў лясу:—цясют, цясют, цясю-ю-ютка-а... Сват Мікола ўспамінаў карчму, дзе ён з кумам Рыгорам чокаліся кілішкамі, пелі «Лазара багатыра» і ганяліся за прыгожай гаспадыняю.

Быў на вясельлі і поп з мясцовай царквы. Спачатку сядзеў ціха ў покуце, быццам не прыкмячаючы грахаводніцтва «авечак паствы маёй». А потым, калі выпіў адзіную на другі дзесятак, узьняўся з лавы, устрахнуў космамі валос, направіў крыж на грудзёх і, пераступаючы з нагі на нагу, быццам з амбону пачаў:

— Я, мае дарагія, сёньня п'яны. А калі мы п'яныя, то ўсе роўныя. І гаспадар Гаўрыла, і я, і Ганчарык... Ты Ганчарык добры чалавек... Ты сакратаром Хутарскага сельсавету, Чэрвенскага раёну, Менскай акругі, Беларускай... і-і-к... Сацыялістычнай... і-і-і-к... Савецкай... Імпэрыі... і-і-к... рэспублікі... Я поп... Я служу народу, і ты служыш народу.. Ты пэнсію атрымліваеш, я каляду зьбіраю.

Госьці падхапілі айца і сэкратара сельсавету на п'яныя рукі, падкінулі пад столь так, што яны стукнуліся галовамі аб закураныя дошкі. Зноў раскачвалі, кідалі, падхоплівалі. Ганчарык в айцом камічна рабілі экскурсіі—брудны мост,—закураная столь,—і кружыліся ў ліхаманкавым калаўроце. Поп, захлёбваючыся ад радасьці, паўтараў на кожнай «астаноўцы—станцыі»:

— Мы роўныя... Ты пэнсію, я каляду... І жывём у адной імпэрыі... і-і-к... рэспубліцы.

Цім. Зарэчны.

Будаўніцтва лёзьненскага камбінату зрываецца.

У нашай газэце яшчэ летась пісалася аб тым, што праэкты на будаўніцтва Лёзьненскага ільнаапрацоўчага камбінату прасоўваюцца вельмі марудна. З таго часу прайшоў амаль цэлы год, а справа ня толькі не палепшылася, а наадварот, значна пагоршылася. Гэта «пагоршаньне каштуе ўжо дзяржаве 90.000 руб., якія былі патрачаны на падрыхтоўчыя работы, на пабудову грэблі на рацэ Мошне і г. д., а ці будзе будавацца сёлета камбінат, яшчэ пытаньне. Справа ў тым, што па дагавору Белсельтрэсту дзяржаўнае кансультацыйнае тэхнічнае будаўнічае бюро пры ВСНГ СССР, якое скарочана завецца «Стройконсультацыя», узяло на сябе абавязак скласьці праэкт і каштарысы на пабудову Лёзьненскага камбінату да 1 студзеня 1929 г. У зувязі з гэтым дагаворам Белсельтрэст правёў усе падрыхтоўчыя мерапрыемствы па пабудове камбінату як у галіне пабудовы дамбы і загатоўкі патрэбных мутар'ялаў, так і ў адносінах найму рабочае сілы. Але, калі наблізіўся тэрмін падачы праэкту, выявілася, што „Стройконсультацыя" ня выканала дагавору. Белсельтрэст тады камандыруе ў Маскву спэцыяльнага тэхніка, у абавязкі якога павінна было ўваходзіць „падштурхваньне" да хутчэйшага складаньня праэкту. Але і гэта мера не памагла. „Стройконсультацыя" падрад адкладала складаньне праэкту з 1-га студзеня на 18-га студзеня, далей, гэты тэрмін адсоўваецца да 1-га сакавіка. У сваім адносьніку ад 18-га лютага „Стройконсультацыя» катэгарычна ўпэўніла Белсельтрэст, што праэкт і каштарысы будуць высланы 1-га сакавіка, прычым у тэлеграме за № 34-8 літаральна значыцца: „Заўтра высылаюцца праэкт і каштарысы".

Ня гледзячы, аднак, на сур'ёзнасьць завярэньняў і гарантыі выслаць у вызначаны тэрмін праэкт, «Стройконсультацыя» свайга абяцаньня і на гэты раз ня выканала. Раптам 11-га сакавіка ў Менск прыехаў ад «Стройконсультацыі» інжынэр Шчавінскі, які заверыў, што праэкт будзе гатоў 16-га сакавіка, але і гэта аказалася няпраўдай, бо толькі нядаўна распачалі распрацоўваць праэкт і каштарысы.

Зараз-жа на месцы пабудовы ільнакамбінату 80 рабочых нічога ня робяць з тэй прычыны, што нельга прыступіць да працы. Але гэтага мала. Зараз сапсавалася дарога. Правалена кампанія па вывазцы патрэбных матар'ялаў. Будзе сарвана будаўніцтва буйнейшага і адзінага на абшарах БССР ільнакамбінату.

Справу з невыкананьнем дагавору трэба разглядаць ня як звычайнае спазьненьне складаньня праэкту, а як злоснае шкодніцтва, што відаць з цэлай сэрыі няправільных інфармацый «Стройконсультацыі» аб ходзе складаньня праэкту.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Здадзена звыш 10 тыс. пудоў хлеба.

Калектыўная заготоўка праводзіцца па ўсіх райёнах Меншчыны. Паводле вестак, чырвоныя абозы здалі больш 10 тысяч пудоў хлеба. На першым месцы ідзе Койданаўскі райён, у якім пераважна беднякі здалі каапэрацыі каля 6 тысяч пудоў лішкаў хлеба. Потым ідуць Вузьдзенскі райён—1 тысяча 500 пудоў, Пухавіцкі—1 тысяча пудоў, Сьмілавіцкі—700 пудоў. Некаторыя райёны, па прыкладзе Койданаўскага, пачынаюць раскачвацца ад сьпячні, а некаторыя яшчэ сьпяць.

З памольным зборам сёлета ня зусім добра. Гадавы плян выканан на 80 проц. Але ўсё-ж сёлета менш пагроз, ёсьць надзея, што плян будзе выканан, калі будзе зьвернута належная ўвага.

Справа з загатоўкай другарадных тавараў (рызьля, касьцей, сьметанковага масла)—вельмі кепская. Плян выканаць на 30 процантаў.

Памылкі ў кампаніі загатовак павінны быць выпраўлены.

Грознае папярэджаньне.

Магілеў, 29-3. А 7-й гадзіне ўвечары 26 сакавіка была дадзена трывога аб пажары на дзяржаўным скурзаводзе імя Лекерта (на Лупалаве). Хутка прыбыўшая магілеўская прафесыянальная пажарная каманда ліквідавала пажар. Пры гэтым, начальнік каманды канстатаваў падпал: у разьдзявальні для рабочых гарэлі старыя спэцвопраткі, змочаныя нафтаю; наогул, у гэтым месцы (разьдзявальні) пажар мог выбухнуць толькі ад падпалу.

Гэткім чынам, тутака дзейнічала чыясьці злачынная рука, таксама, як і на другім лупалаўскім буйным заводзе («Чырвоная Зорка»), дзе нехта імкнуўся некалькі раз папсаваць млынавыя камні, аб чым раней была заметка ў «Савецкай Беларусі».

А як ахоўваюцца заводы, відаць з другога выпадку пажару, які здарыўся ў гэты-ж самы дзень і таксама на Лупалаве. У 5 г. 40 хв. раніцы з каланчы паведамілі аб пажары. Гараў пасадачны цэх буйнай прамысловай арцелі. Выяўлена, што пажар здарыўся па віне вартаўніка, якім там пастаўлен чалавек ня ў поўным розуме, паўвар'ят. Гэты гора-вартаўнік затапіў сушыльныя печы і сам заснуў, яго самаго абудзілі ўжо пасьля таго, як усё ўнутры было ахоплена агнём. Змагаліся з агнём лупалаўская прафесыянальная каманда і дзьве заводзкія каманды, магілеўская каманда прыбыла позна (пераправілася праз Дняпро па спэцыяльна наведзеных масткох, бо мост з выпадку рамонту быў закрыт і адкрыўся толькі днём). Выгараў увесь цэх, страт на згараўшых скурах каля 16 тыс. руб. (на гэткую-ж суму адратавана скур), самы будынак належаў прыватнай асобе.

У гэтай пажарнай сувязі варта яшчэ раз сказаць пра захоўваньне нашымі заводамі і ўстановамі попелу. «Савецкая Беларусь» ужо падавала, што ў Магілеўскім райвыканкоме попел захоўваецца... на гары; астатнія прадпрыемствы і ўстановы трымаюць яго ў драўляных скрынках. Абавязкова трэба праверыць, ці не пагражае ў пажарных адносінах попел (калі ён захоўваецца блізка каля будынкаў і г. д.), а таксама абмеркаваць, ці ня лепш было абавязаць прадпрыемствы мець замест драўляных—мэталёвыя скрынкі, бо ёсьць небясьпека таго, што замест разумнага зьбіраньня попелу каштоўнейшыя будынкі могуць самі ператварыцца ў попел.

Квік.

Пабудова ільна-апрацовачнага заводу.

ПОЛАЦАК, 30-3. Спэцыяльнай камісіяй абрана і зацьверджана АВК канчатковае месца для пабудовы ільна-апрацовачнага заводу. Завод будзе будавацца на тэрыторыі Дрысенскага раёну, каля ракі Дрыса, на плошчы звыш як 20 гэктараў.

Папярэднія вынікі двухтыднёвіка ашчаднасьці.

ПОЛАЦАК, 30-3. Двухтыднёвік ашчаднасьці ў самым разгары. Прыкмячаецца, што некаторыя арганізацыі, у зьвязку з працягваньнем двухтыдзёвіка, узварухнуліся.

На 16 сакавіка па Вульскаму раёну ўжо мяецца 622 новых укладчыкаў, альбо 5253 укладаў; па Вушацкаму—379 укладчыкаў, 5198 укладаў; па Расонскаму—511 укладчык, 2232 укладаў; па Вальпнецкаму—264 укладчыкі, 2447 укладаў; па Дрысенскаму—120 укладчыкаў, 3803 укладаў; па Ветрынскаму—185 укладчыкаў, 2833 уклады; па Лепельскаму—203 укладчыкі, 1755 укладаў; па Асьвейскаму—208 укладчыкаў, 610 укладаў; па Полацкаму—189 укладчыкаў, 1264 уклады і па гораду мяецца 623 новыя укладчыкі, альбо 26309 новых укладаў.

Сіламі грамадзкіх арганізацый ст. Фарынава завярбавана 1001 новых укладчыкаў, на агульную суму 1800 р. Усе прафарганізацыі Вушацкага раёну ўхвалілі адлічыць 10 проц. пэнсіі ў касу ашчаднасьці. Сябры сельсавету амаль усе ўступілі ў касу ашчаднасьці. Вучні Мачулінскай школы, Старадворскага сельсавету, Расонскага раёну цалкам уступілі ў касу ашчаднасьці. Друкары выдавецтва «Чырвоная Подачына» таксама ўступілі цалкам.

117,3 тоны здадзена хлеба.

КАПЫЛЬ, 29-3. У падарунак V-му раённаму зьезду саветаў Капыльскага раёну працоўнае сялянства Капыльскага раёну калектыўна здало мясцовай каапэрацыі 1052 пуд. збожжа (усяго па раёну здадзена калектыўна збожжа 117,3 тоны).

Супроць сьвяткаваньня вялікодня.

ГОМЕЛЬ, 30-3. У акрузе распачалася антырэлігійная кампанія.

На прадпрыемствах і клубах праводзяцца гутарні і даклады.

Многія саматужнікі адмаўляюцца ад сьвяткаваньня вялікодня і выпечні мацы. Некаторыя саматужна-прамысловыя арцелі арганізуюць перакліччу на адмаўленьне ад мацы і рэлігійных сьвяткаваньняў.

Пачалася чыстка пэнсыянэраў.

МАГІЛЕЎ, 30-3. У дапамогу па праверцы складу пэнсіянэраў, у мэтах ачысткі яго ад розных былых людзей, магілеўскай страхкасай заклікана рабочая грамадзкасьць.

Нядаўна зьнята з пэнсіі 10 інвалідаў—былых паліцэйскіх.

М. ЛЯЎКОЎ.

НЕБЯСЬПЕКА ПРАВАГА ЎХІЛУ І БАРАЦЬБА З ІМ.

«... Яшчэ больш узмацніць у далейшым работу па выяўленьні і выкрыцьці ўхілаў ад Ленінскай лініі, сканцэнтроўваючы галоўную, асноўную ўвагу на правым ухіле, і прымірэнцтва з ім, як на галоўным ухіле, галоўнай небясьпецы, як на менш выкрытым ухіле для партыі на даным этапе сацыялістычнага разьвіцьця, не паслабляючы барацьбы з «левымі» хістаньнямі ў партыі (у бок трацкізму)».

(З пастаноў XII Зьезду КП (б)Б)

На даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва найбольш небясьпечным зьяўляецца правы ўхіл і прымірэнцтва да яго. Правы ўхіл, як і ўсе ўхілы ад лініі прыходзілася перамагаць нашай партыі,—невыпадковасьць. Сацыяльная база яго захоўваецца, як сказаў т. Сталін, „у пераважваньні дробнай вытворчасьці ў нашай краіне, у вырастаньні з дробнай вытворчасьці капіталістычных элемэнтаў, у абкружэньні нашай партыі дробна-буржуазнай стыхіяй і, нарэшце, у фактце заражэньня гэтай стыхіяй некаторых зьвеньняў нашай партыі».

На базе новай эканамічнай палітыкі, пры рашучым разгортваньні барацьбы сацыялістычных і капіталістычных элемэнтаў, дзе вырашаецца пытаньне—«хто каго»—сацыяльная база ўхілаў ад ленінскай палітыкі партыі ўзмацняецца. Хістаньні адсталых з прычынай дробнага ўласьніка пластоў сялянства, іх сумненьні і палоханьні перад цяжкасьцямі, пракрадваюцца ў шэрагі больш адсталых рабочых. Гэтыя-ж настроі перадаюцца менш вытрыманым і ўстойлівым камуністам. Адсюль ухілы ад Ленінскай партыйнай лініі, адсюль сьвядомае нежаданьне некаторымі камуністамі праводзіць правільна партыйную лінію, адсюль скрыўленьне партыйных дырэктыў, адсюль зусім не выпадковы такія заявы, як «прашу ўстрымацца ад прыёму мяне ў калектыў»—(сакратар ячэйкі Дабраволькі), альбо „лепш тыя сродкі, якія прызначаны для калектывізацыі, неабходна ўкладваць у індывідуальныя гаспадаркі" (Ястратоўскі).

Правыя ўхілісты і прымірэнцы да іх палохаюцца цяжкасьцяй, якія паўстаюць на шляху сацыялістычнага будаўніцтва. Часовыя цяжкасьці, выкліканыя члстковым неўраджаем 1928 году, яны тлумачаць як дэградацыю сельскай гаспадаркі. Правыя ўхілісты губляюць веру ў здольнасьць рабочае клясы займаць кіруючую ролю ў справе сацыялістычнага будаўніцтва. Яны ня бачаць дасягненьняў сацыялістычнага будаўніцтва, ня бачаць таго, што саюз рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства ўзмацняецца, а наадварот—абвастраньне клясавай барацьбы ў горадзе і вёсцы тлумачаць як размычку гэтага саюзу. Яны хочуць паслабіць кіруючую ролю пралетарыяту, гэта значыць, паслабіць вядучы пачатак і ўзьдзейнічаньне сацыялістычнай прамысловасьці ў справе разьвіцьця і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на калектыўных падставах.

Гэта знаходзіць свой адбітак—вольна ці нявольна—у выступленьнях, пакуль што, некаторых партыйных працаўнікоў, у прыватнасьці „на сходзе ячэйкі Гомельскага Акрэа, як паведамляе матар'ял з мейсц—па дакладу аб XII зьезьдзе КП(б)Б сябра партыі гэтай ячэйкі тав. Самусэвіч, старшыня аддзяленьня Гомельскага С.-Г. Банку, у сваім выступленьні даказваў няправільнасьць нашага капітальнага будаўніцтва, гаворачы, што партыя займаецца асінбудамі, траціць многа сродкаў, праводзячы паказное, параднае будаўніцтва, а ня будуе прамысловасьці для шырокага абслугоўваньня спажыўца»..., а тав. Нарановіч, работнік Мазырскага Дзяржфінкантролю ў сваім выступленьні ставіў пытаньне аб неабходнасьці павялічэньня ўкладаньняў у сельскую гаспадарку за кошт памяншэньня тэмпу індустрыялізацыі».

Такім чынам, па думцы Самусэвіча выходзіць, што «партыя займаецца парадным будаўніцтвам», а Нарановіч проста і адкрыта ставіць пытаньне «скараціць укладаньні ў будаўніцтва сацыялістычнай прамысловасьці». У выніку адзін і другі—хочуць яны таго ці ня хочуць—прыходзяць да таго, каб зьнізіць тэмп індустрыялізацыі, паслабіць вядучы пачатак прамысловасьці, паслабіць кіруючую ролю пралетарыяту. А гэта і ёсьць правы ўхіл.

Правы, адкрыта апартуністычны ўхіл «не дваэньвае сілу нашых ворагаў, сілу капіталізму, ня бачыць небясьпекі ачаўленьня капіталізму, не разумее механікі клясавай барацьбы ў умовах дыктатуры пралетарыяту і таму так лёгка ідзе на ўступкі капіталізму, патрабуючы зьніжэньня тэмпу разьвіцьця нашай індустрыі, патрабуючы палягчэньня для капіталістычных элемэнтаў вёскі і гораду, патрабуючы адсоўваньня на задні плян пытаньня аб калгасах і савгасах, патрабуючы зьмякчэньня манаполіі замежнага гандлю і г. д.» (Сталін).

Замест напружанага тэмпу індустрыялізацыі краіны, замест напружанай работы па рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі на базе індустрыялізацыі, замест рашучага наступленьня на капіталістычныя элемэнты, якое праводзіць партыя па ўсяму фронту сацыялістычнага будаўніцтва, замест мабілізацыі ўсіх працоўных мас на чале з рабочай клясай,—правы адкрыта апартуністычны ўхіл трымае курс на разьвіваньне капіталістычных элемэнтаў у краіне, ён нямінуча вядзе да рэвізіі палітычнай лініі партыі, да адмаўленьня ад генэральнай лініі партыі, вызначанай XV зьездам УсеКП(б)—гэта значыць: да скарачэньня тэмпу індустрыялізацыі, да перагляду пытаньня аб цяжкай індустрыі ў бок яе скарачэньня, да паслабленьня тэмпу сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі—да скарачэньня пабудовы калгасаў і савгасаў, да паслабленьня наступленьня на кулака.

Такім чынам, прыхільнікі правага ўхілу і прымірэнцы да яго, хочуць яны таго ці ня хочуць, імкнуцца на справе рабіць тое самае, што рабілі і трацкісты. Калі трацкісты адмаўляюць саюз рабочае клясы з асноўнай масай сялянства, дык правы ўхіл робіць асноўную памылку таксама ў пытаньні ў адносінах да сялянства, толькі, з другога боку,—правыя ўхілісты і прымірэнцы да іх не дааценьваюць ідэю кіраўніцтва рабочае клясы ў саюзе рабочых і сялян, а гэта ў канечным выпадку вызначае адмаўленьне ад пасьлядоўнага праведзеньня клясавай пралетарскай лініі, гэта баязьнь прызнаваць ролю рабочае клясы як кіраўніка ў справе сацыялістычнага будаўніцтва. Адсюль можна бачыць, што правы ўхіл і прымірэнтва да яго таксама як і «левы» ўхіл (у бок трацкізму) аднолькова рэвізуе і падмяняе асноўны Ленінскі тэзіс «вышэйшы прынцып дыктатуры, гэта—захаваньне саюзу пралетарыяту з сялянствам, каб пралетарыят мог трымаць кіруючую ролю і дзяржаўную ўладу».

Контр-рэвалюцыйная сутнасьць трацкізму партыі і ўсёй рабочай клясе добра вядома. Яна выкрыта на працягу ўсёй барацьбы партыі з трацкізмам, яна паказана ў апошніх часы паводзінамі «містэра Троцкага». Правы ўхіл толькі пачаў афарміцца; ён выяўлен партыяй, як небясьпечная плынь, якая мае карэньні ў тэй дробна-буржуазнай стыхіі, што абкружае партыю і давіць на няўстойлівыя элемэнты партыі. Але-ж сутнасьць і ўсю небясьпеку, якую нясе правы ўхіл і прымірэнцтва да яго, яшчэ ня ўсе члены партыі ўявілі і зразумелі. Матар'ялы з месц гавораць, што «ў практычнай рабоце паасобных камуністаў, асабліва у вёсцы, маюцца факты, якія адбіваюць моманты праламеньня правага ўхілу, часта несьвядома, дзякуючы неўсвяленьню лініі партыі» (Мазырская акруга); альбо, ня гледзячы на тое, што „пытаньне аб правым ухіле ў нашай арганізацыі хоць і прапрацоўвалася на актывах і ячэйкавых сходах, але ўсё-ж такі маюцца паасобныя таварышы, якія і да гэтага часу дастаткова не зразумелі гэтага пытаньня" (Магілеўская акруга).

Прыведзеныя прыклады гавораць і аб тым, што барацьба партыйных арганізацый і ячэек супроць правай небясьпекі і прымірэнцтва ў значнай меры, пакуль што, праводзіцца ў напрамку агульнага растлумачэньня ўхілаў. У шэрагу месцаў справа гэта не пасоўваецца далей таго, што робіцца заклік змагацца з правай небясьпекай, а прыклады гэтай небясьпекі ў яе канкрэтнай форме не ўяўляюцца і барацьба з імі на справе як сьлед яшчэ не вядзецца. Адсюль можна бачыць, што ў некаторых месцах на сходах партыйцы галасуюць супроць усялякіх ухілаў, а ў практычнай рабоце дапускаюць гэтыя ўхілы. Аб гэтым Бабруйская АКК паведамляе: „Па пытаньню аб правым ухіле ў партарганізацыі вядзецца шырокая кампанія па растлумачэньню. Выпадкаў выступленьня ў абарону правага ўхілу не зарэгістравана. Што-ж датычыцца праяўленьня правага ўхілу ў практычнай рабоце, у асаблівасьці ў вёсцы, дык гэта мае месца».

Барацьба з правым ухілам і прымірэнцтвам да яго будзе больш каштоўнай, яна дасьць большыя вынікі, калі партыйныя арганізацыі і ячэйкі будуць ня толькі адзначаць, што „настроі правага ўхілу ў арганізацыі маюцца", альбо «правы ўхіл мае некаторае ажыўленьне», а будуць растлумачваць сутнасьць правай небясьпекі і адначасова будуць выяўляць і наказваць партыйцам на канкрэтных прыкладах, адкуль гэта небясьпека ідзе, як з ёй трэба канкрэтна змагацца ў умовах тэй ці іншай ячэйкі, тэй ці іншай арганізацыі.

У горадзе і асабліва ў вёсцы правы ўхіл знаходзіць і будзе знаходзіць свой выраз у практычных гаспадарчых і культурных пытаньнях, у пытаньнях савецкага і каапэрацыйнага будаўніцтва, у настроях і дзейнасьці паасобных прапаўнікоў. З матар'ялаў паасобных АКК можна бачыць, што ўхілы ад лініі партыі на практыцы вядуць да забыцьця клясавага інтарэсу і непасрэднага абслугоўваньня клясавых ворагаў. Так «старшыня Беляўскага сельсавету, сябра партыі ЖОГЛА і сакратар таго-ж сельсавету, кандыдат партыі ПОПОК шырока дапамагалі кулацкай часьці скупаць зямлю, рэгіструючы гэтыя дагаворы як арэндныя, альбо бяз усялякай рэгістрацыі, пералічваючы зямлю пры вучоце аб'ектаў абкладаньня з аднаго двара на другі.» А сябра партыі Бабноў (Жыткавіцкая арганізацыя) у сваіх выступленьнях казаў, што «камуністам неабходна весьці растлумачальную работу, але самім у калектыў пакуль што ісьці няма чаго, паколькі калектывы неаўтарытэтныя сярод сялянства і не апраўдваюць сябе». У Чарэйскім-жа раёне сябра партыі Якушэвіч, ня гледзячы на папярэджваньні РК, атрымаў пазыку ў 133 р. і перадаў свайму бацьку, моцнаму гаспадару, для скарыстаньня.

З гэтага можна бачыць, што ў нас у партыі—асабліва ў вёсцы—ёсьць паасобныя, адсталыя і нявытрыманыя камуністы, якія поўнасьцю адбіваюць настроі адсталых беспартыйных мас, якія забываюць лінію партыі, якія адмаўляюцца ад калектывізацыі сель

ЛІТАРАТУРА—МАСТАЦТВА—КРЫТЫКА.

Аб мастацкай літаратуры навучальных установаў.

(З УСЕБЕЛАРУСКАЙ СТУДЭНЦКАЙ ВЫСТАЎКІ НАСЬЦЕНГАЗЭТ І ЧАСОПІСАЎ).

Мастацкая літаратура на ўсебеларускай выстаўцы насьценгазэт студэнцтва Беларусі прадстаўлена часопісамі «Рунь»—мастацка-літаратурная і грамадска-бытавая часопісь літгуртка пры Рагачоўскім Пэдтэхнікуме, „Крыніца" літаратурна-мастацкая часопісь Менскага пэдтэхнікуму і «Водгульле» часопісь Віцебскага пэдтэхнікуму.

Як літаратурна-мастацкія і грамадска-бытавыя часопісі, яны павінны адбіваць грамадзкае жыцьцё наогул і той установы пры якой выдаецца часопісь. Толькі ў апошнім нумары „Рунь" па першай старонцы ў артыкуле «Задачы бягучага году», ставіцца пытаньне аб тым, што за мінулы год часопісь не адбівала жыцьця той установы, пры якой выдаецца часопісь і працуе літаратурны гурток. У часопісі зьмяшчаліся апавяданьні, вершы, нават, крытычныя артыкулы, але зусім не закрапалася пытаньне грамадзкага і бытавога жыцьця тэхнікуму.

«Крыніца» і «Водгульле» пакуль што не займаюцца гэтым пытаньнем і як відаць, ня думаюць займацца. У іх пераважае літаратурны матар'ял.

Шкода, што многія з маладых паэтаў, калі іх так можна назваць, разьлітаюць нікому непатрэбныя настроі. Вось напрыклад піша адзін з такіх—Аляшкевіч:

„Снова осень седая и старая,
Снова грязно і гадко в душе.
Эта улица точно ржавая,
Всюду ржаво... Везде... Везде"...

далей:

«А тут люди все словно мощи
Мне их жаль, мне их очень жаль».

Людзі гэтыя па «тэорыі» Аляшкевіча бегаюць, нервуюць, ня выконваюць вялікіх правіл гігіены.

«Они бегают, едят, волнуются,
Задыхаются в черном дыму.
Небо серое дуется... дуется...
Оно дуется на землю»...

Паэта не знаходзіць месца на зямлі і таму ён рвецца ў нешта надземнае, але не знайшоўшы месца ён ізноў зварачаецца да гэтай «серой» зямлі:

«Снова серая, злая, нелепая жизнь
Холод, снег и высокие кручи».

Другі верш Аляшкевіча «Водгульле» мае 50 строф. Гэта ня верш, а цэлая паэма жыцьця паэты з якога яму няма выйсьця. Яго цягне да старой патрыархальнай вёскі, але ён бачыць на беразе ракі замест драўляных масткоў новую з электрычнасьцю прыстань, ад якой ён уцякае да старэнькай хаткі, але і тут:

„Поглядел, а у дома немцы:
В том углу где была иконка
Возвышается ныне антенна,
На антенне флажочек синий".

У вёсцы будуецца новае жыцьцё, але і гэта не падабаецца паэту.

«Я хочу слушать звонкие трели.
Что мне раньше певал соловей.
Мне но радию их не нели—
Я их слушал в саду у ветвей".

Старое зьнішчаецца ў вёсцы, нараджаецца новае і ў гэтым новым Аляшкевіч бачыць толькі:

«Все что было провало и нет его
(В гонвардоме играет «джаз-банд»)
Платье моды «мужчинам некогда»
Заменило простой сарафан».

Ён кажа, што толькі застаўся такі ім адзін.

«Я один. Я оскротелый.
Буду петь и кричать о луне».

Было-б вельмі добра, калі-б Аляшкевіч быў толькі адзін, але нажаль сярод нашай вучнёўскай моладзі яшчэ ёсьць шмат Аляшкевічаў, якія апяваюць песьні салаўя, «луну», сінія вечары, сум і безнадзейнасьць.

У часопісі «Рунь» ёсьць шмат такіх «лірычных паэтаў» як зазначае адзін з супрацоўнікаў гэтай часопісі.

Галоўнымі матывамі гэтых паэтаў зьяўляюцца матывы каханьня, каляндарнае апісаньне зьмен году і зьяў прыроды. Усёй гэтэй «лірыцы» грош цана, калі толькі браць сэнсавы бок (аб фармальным нельга нават і казаць, бо ён ня вытрымлівае элементарных правіл пабудовы вершу).

Гэта ня значыць, што ў часопісі «Рунь» няма бадзёрых матываў, не адбіваецца сучаснасьць. Вершы „Чырвонаму студэнцтву", «Кастрычнікаўская баллада» і некаторыя іншыя адбіваюць сучаснасьць. У іх яскрава адбіваецца барацьба за пабудову новага жыцьця, заклік да сацыялістычнага будаўніцтва. Наогул кажучы „Рунь" апошні нумар падае некаторыя надзеі на папраўку.

Проза «Руні» надзвычайна слабенькая і пра яе нават і гаварыць няма сэнсу.

З артыкулаў можна падкрэсьліць артыкул Харовіча. Гэта артыкул з «прэтэнзіяй» на навуковую працу, але яго зусім ня цікава чытаць. У № 1 за 1929 год «Руні» у канцы зьмешчан артыкул Мікуліча «Аб каштоўнасьці „Руні" і некаторых крытыках», які хоча рэабілітаваць сваіх „пісьменьнікаў" перад грамадзкасьцю.

Дрэнна тое, што Мікуліч у артыкуле ня хоча глядзець аб'ектыўна на рэчы і ня выказвае таго, што большасьць вершаў «Руні» дрэнна апрацавана, наглядаецца бязсэнсавы падбор рыфмаў і таксама яскрава выяўляецца бязсюжэтнасьць. «Крыніца» па зьместу і апрацоўцы матар'ялу стаіць значна вышэй «Руні».

Вершы Маракава, Ліхадзіеўскага і іншых па апрацоўцы і па адбіцьцю абкружаючага жыцьця зьяўляюцца досыць сур'ёзнымі рэчамі.

Проза „Крыніцы" таксама займае даволі значнае месца ў часопісі і па мастацкай апрацоўцы зьяўляецца больш-менш удалай.

Аддзел народнай творчасьці пажадана мець больш пашыраным. Але дрэнным зьяўляецца тое, што «Крыніца» не адбівае грамадзкага жыцьця і наогул мала закранае сучаснае літаратурнае жыцьцё. Крытычных артыкулаў, артыкулаў аб пралетарскай літаратуры і марксысцкай крытыцы няма.

Падагульваючы ўсё гэта можна зрабіць вывады. Літаратурны рост моладзі ў навучальных установах відавочны. Моладзь шмат піша і піша вельмі дрэнна, бо ёй не хапае літаратурнай вучобы, але самае галоўнае тое, што частка пісьменьнікаў падпадае пад настроі варожых элементаў грамады і ў сваіх творах яскрава праводзіць ідэалёгію варожай нам клясы. Неабходна больш яскравае і рашучае кіраўніцтва партыі і камсамолу ў літаратурных гурткох пры навучальных установах і, падругое, неабходна рэагаваць на хібы творчасьці пачынаючых паэтаў і пісьменьнікаў.

М. К—оў.

1-ы Беларускі Дзяржаўны Тэатр на пераломе.

(Аб пастаноўцы „Мост").

Цэнтральная ідэя, якою кіраваўся аўтар п'есы «Мост», сама па сабе каштоўна. Сэнс яе ў тым, што Рамановіч зрабіў спробу сцэнічна паказаць шкодніцтва на шляхох індустрыялізацыі нашага Саюзу. «Мост»—гэта сымбаль нашага індустрыяльнага будаўніцтва. Між іншым зазначым, што «Мост» як сымбаль, узяты аўтарам ня зусім удала, бо цэнтральная ідэя індустрыялізацыі не ў будаваньні мастоў. Але-ж гэта між іншым.

Рамановіч імкнуўся адбіць складаны пераплёт узаемадносін паміж рознымі пластамі спэцыялістаў: паміж новымі—нашымі—і старымі, якія замілаваны сваёю працаю і шчыра да яе адносяцца, а таксама паміж тымі спэцыялістамі, якія ня могуць зьмірыцца з пралетарскай дыктатурай і сумленна служаць сваім былым гаспадаром сваёю шкодніцкай, разбураючай работай. Вось гэты складаны лябірынт і зьяўляецца цэнтральным гвоздом п'есы.

Ня гледзячы, аднак, на поўную жыцьцёвасьць ідэі, трэба прызнаць, што аўтар не асіліў вызначанай задачы, не дасягнуў сваёй мэты. Зусім навярхоўнае выяўленьне складаных узаемадносін паміж рознымі пластамі спэцыялістаў, таксама як і работа эмісараў былых гаспадароў. Таксама павярхоўная, простая і некалькі наіўная разьвязка гэтае сацыяльнае драмы.

Асноўны прыём, якім карыстаўся аўтар для матывізацыі сюжэту,—гэта простае, прымітыўна-лёгічнае даказацельства. Асноўнае, што выяўляе душу мастацкага твору—мастацкасьць, эмацыянальнасьць адсутнічае. Больш таго, на працягу ўсёй п'есы няма ніводнага мастацкага вобразу.

Аўтарам таксама ня ўлоўлена і ня дана тая сацыяльная псыхіка, якая няўхільна ідзе з усякім зьявішчам. У выніку—замест мастацкага твору перад намі інсцэніраваны артыкул, досыць значнага разьмеру. Спроба Рамановіча абгрунтаваць псыхалёгічна пярпліваськь інжынэра Чужакова да эмісараў эміграшчыны таксама няўдала і выпадкова. Яна не абмоўліваецца ходам усёй п'есы.

Аўтар ня змог глыбей упікнуць у сэнс адбываючагася ў нашай рэчаіснасьці, а ўзяў толькі навярхоўныя зьявы ў такім выглядзе, як яны яму ўявіліся.

У п'есе шмат выпадковага і непатрэбнага матар'ялу, які арганічна ня ўвязан з асноўным зьместам. Мясцамі гэты выпадковы матар'ял проста такі шкодзіць твору, ператварае яго ў убоства, цыркацтва, сіняблюзьніцтва ў інсцэніраваньні рабочымі ходу цягніка; жарт падвешываньнем Мухіна, гвалтаваньне. Праўда тут значная частка падае на фантазыю рэжысэра. Бязумоўна, жарты патрэбны, асабліва ў такім сухім творы як «Мост», але-ж жарты ня выходзячыя са зьместу рэчы.

Таксама Рамановіч ня здолеў сынтэзаваць будаўнікоў—рабочыя масы і кіраўнікоў. Асабліва прывалі ує ўсемагутная асоба, але творчага планамернага працэсу рабочае масы няма і ў паміне. Ні ў якім разе нельга за апошняе лічыць нарывы рабочага да бойкі з Мухіным, таксама і боль сэрца ці баязьнь за лёс „Мосту". Цасыўны бок толькі і даны. Ня была таксама і кіруючая рука будаўнічага працэсу—партыя, яна прадстаўлена ў асобе сэкратара ячэйкі так сабе радзі доўгу ўведзенага ў п'есу.

Ня сур'ёзным трэба лічыць падбор прозьвішчаў для пэрсанажу. Стары спэц празваны—Чужаковым, чытай „чужы", новы спэц—Сваевічам, чытай „свой". Толькі адно ўпамінаньне гатых прозьвішчаў у пачатку першага акту падказвае далейшы ход і напрамак.

Агульны вывад: Рамановіч, як аўтар, зрабіў некалькі крокаў уперад тым, што малады драматург ад мяшчанскага абывательскага погляду і ўспрыняцьця рэальнага ходу ударэньняў, як гэта выяўлена ў яго «Крывой Абліне» імкнецца стаць на шлях правільнага адбіваньня і сынтызацыі рэчаіснасьці. Але ўзяўшы для афарміленьня рэчаіснасьць у яё супярэчнасьцях ён аказаўся бассільным здолець яе.

Праўда, выканаўцы стараліся папоўніць прабелы аўтара ўвядзеньнем у ход п'есы.

Некалькі слоў аб афарміленьні. Нельга сказаць, што афарміленьне знаходзіцца ў поўнай гармоніі з усёй п'есай. Грамадзкасьць і адналтоннасьць „Мосту" месцамі зусім прыдушвае жывых выканаўцаў. Усё-ж ня гледзячы на тыя недахопы і адмоўныя бакі, якія мы зазначылі, пастаноўка «Мосту» зьяўляецца некалькі дадатным, дадатным у тым сэнсе, што тэатр імкнецца ісьці ў ногу з нашым разьвіцьцём і запатрабаваньнямі гледача. Пастаноўка «Мосту» каштоўная і тым, што яна прымушае актора ўнікнуць у нутро псыхікі дзелчых сацыяльных тыпаў сучаснасьці. Пастаноўка «Мосту» дае некаторыя новыя моманты ў тэхніцы ігры акторaў. Далейшы крок аўтара, які пачынае ўзыходзіць на больш правільны шлях, павінен ісьці па лініі адказу ад компіляцыйнасьці ў больш глыбокае ўнікненьне ў нутро працэсаў нашай рэчаістасьці, у паглыбленьне і вывучэньне іх, а таксама і вывучэньне тэй сацыяльнай псыхалёгіі, якая абмоўліваецца гэтымі працэсамі.

Л. Бэндэ.

СУЧАСНАЕ БЕЛАРУСКАЕ МАСТАЦТВА.

Праводнік па аддзелу сучаснага белар. малярства і разьбярства Бел. Дзярж. Музэю. Апрацавалі: М. Шчакаціхін і В. Ластоўкі. Менск, 1929 г.

Шпаркі рост беларускай культуры пачынае абхапляць усё шырэй і шырэй асобныя сэктары культурнага будаўніцтва, наогул, і выяўленчае мастацтва, у прыватнасьці.

Ужо зараз мы маем значны лік мастакоў розных напрамкаў і дыяпазонаў, якія працуюць у галіне сучаснага беларускага мастацтва, якія яго ўжо і стваряюць.

Але адным з асноўных монантаў працы нашых мастакоў і мастацкіх аб'яднаньняў павінна быць шчыльная сувязь з працоўнымі масамі, прыслухоўвацца да іх заўваг і ацэнкі.

Гэта сувязь павінна ажыцьцяўляцца як праз выстаўкі (і ня толькі ў Менску), так, галоўным чынам, праз выданьне альбомаў, рэпрадукцыі, мастацкае афарміленьне беларускай кніжкі і г. д.

Кніжка, што выдана Белдзяржмузэем да 10-годзьдзя БССР, зьяўляецца амаль што першай ластаўкай у справе асьвятленьня сучаснага мастацтва. У гэтай кніжцы асьвятляюцца тыя мастакі, якіх працы знайшлі прытулак у сьценах музэю.

Уводны артыкул тав. Шчакаціхіна (апрача прадмовы) адпатоўвае асноўныя вітні разьвіцьця сучаснага мастацтва, кароткa асьвятляючы асноўныя плыні і кірункі беларускага малярства і разьбярства.

Артыкул вельмі схематызаваны і вычарпальных даведак, вядомая справа, не дае.

Пасьля рэестру экспанатаў, які складзены параўнальна добра, зьмешчаны здымкі, відаць лепшых (на думку аўтараў) твораў мастакоў.

Перадача некаторых экспанатаў зроблена нядобра. Шмат больш характэрнага (напр., для Якуба Кругера, Філіповіча і г. д.) у рэпрадукцыях не паддзена. Зусім чамусьці няма графікі, дэкаратыўных макетаў. На колькі нам вядома якія колечы экспанаты графікі музэй мае, а калі дэкаратыўных макетаў няма, дык гэта проста нядбайнасьць арганізатараў.

„Сучаснае беларускае мастацтва"—толькі першыя крокі.

Ужо час тэарэтыкам і практыкам мастацтва даць у нашых часопісях як агульныя нарысы пра мастацтва, так і эпюды пра асобных мастакоў.

БД Музэю і БДВ час пакланаціцца аб шырокай рэалізацыі мастацкай прадукцыі.

Барыс Мікуліч.

„ЛУКІШКІ"

(Вершы з Заходняй Беларусі—Алеся Салагуба). БДВ. Менск. 1929 г. Стар. 126. Ц. 85 к.

Перад намі толькі што выйшаўшы зборнік вершаў Ал. Салагуба. У пачатку зборніку зьмешчана невялічкая прадмова. Л. Бэндэ, у якой коратка ахарактарызаваны вершы і паказана на нярэўную долю двух часьцін Беларусі—БССР і захопленай у кінцы польскага арла—Заходняй Беларусі. Калі ў БССР после пераможнага Кастрычніка, ужо больш 10 год ня чутно ёнку і звону царскіх і польска-панскіх ланцугоў, а пралетарыят вольна будуе сацыялізм, дык у Зах. Беларусі і цяпер сьвішча панскі бізун «на грудзях ляжыць ланцуг, руці, ногі моцна скуты» і «сёньня Польшча, як царская Расея,—краіна сьмерці, краіна цёмных крат».

Вось аб гэтай прыгвечанай сацыяльна і нацыяльна фашысцкай Польшчай часьціне Беларусі і яе аўтар зборніку. Невыпадкова назва зборніку „Лукішкі", бо Алесь Салагуб сам «з палёў Заходняй Беларусі», толькі год тому як вырваўся з-за крат віленскай турмы Лукішкі.

З усіх вершаў зборніку толькі чатыры пісаны ў сваёй роднай вёсцы «Заруднічы» і два ўжо—ў Менску, а ўсе астатнія пісаліся аўтарам пад „звон ланцугоў" у гэтай магільнай тунэлі—Лукішкі.

Што-ж гэта за вершы? Сам аўтар аб іх кажа:

«Мае вершы—ня вершы палакаў,
гэта вершы жаданьняў вясны,
гэта вершы змаганьня і працы
мае лепшыя думкі і сны».

Вось гэтыя песьні «змаганьня і працы» не адначаюцца «бляскам формы і часам бываюць шурпатымі, бо: «рытмавалі іх шарыя краты, а тахт мерыў жалезны запор, вось таму выглядаюць шурпатымі, ня блішчаць апрацоўкаю форм»

Затое вершы Салагуба—«гэта ня песьні вастрожнай жальбы, сумоты і роспачы, а песьні цяпкімі надзей, песьні поўныя камсамольскага задору і пачуцьця нянавісьці да ўсясьветнага капіталу, песьні веры, што час помсты надыйдзе і панам «не задушыць у Лукішках сырых камуны ўсясьветная ідэю» і хутка над усім сьветам разьвесьцца сьцяг Маркса і Леніна.

З тэхнічнага боку зборнік выдан добра, бяз друкарскіх памылак, толькі не зразумела, чаму вершы разьмяркованы не ў хронолёгічным парадку—па часу іх напісаньня.

Вельмі пажадана, каб гэтым зборнічкам зацікавілася камсамольская і ўся наша працоўная моладзь, а таксама ўсе сябры Мопр'у, бо ў ім бяз жадных «выкрутасаў», на простай, зразумелай кожнаму мове, вобразна і праўдзіва перададзены тыя ўмовы і ўнутраныя перажываньні палітвязьня, у якіх ён жыве ў польска-панскай турме» ў «могілках жывых».

Л. Бабровіч.

Літаратура—зьвяно грамадзкага жыцьця.

Навейшыя плыні ў заходня-эўрапейскай літаратуры.

У сучаснай заходня-эўрапейскай літаратуры можна заўважыць самыя разнастайныя літаратурныя жанры і напрамкі. Але, ня гледзячы на такую стракатасьць, выразна б'е ў вочы адно: літаратурныя групы рэзка разьмежаваліся ня толькі па эстэтычных адзнаках, але і па грамадска-палітычных імкненьнях. Разумеецца, на Захадзе яшчэ няма сталай клясавай пралетарскай літаратуры, але такія імёны, як Анры Барбюс, П. Амп, Вайян Куцюр'е—у Францыі, Франц Юнг, Іоган Бэхер—у Нямеччыне, Уптон Сінклер—у Амэрыцы рашуча сьцьвярджаюць яе паступовае і няўхільнае нараджэньне.

З другога боку, ня гледзячы на пышны росквіт буржуазнай літаратуры, ня гледзячы на мастацкую ўдасканаленасьць,—лепшых прадстаўнікоў літаратурнага мастацтва агарнула нейкая роспач. Гэта адбіваецца ў шэрагу літаратурных зьяваў, аб якіх мы будзем казаць ніжэй, але наша метка аб гэтым сказаў адзін з выдатных французскіх літаратурных крытыкаў Поль Валеры: «Пры агульным адсутненьні старога мастацтва перад навукай і машынай, літаратура можа зрабіцца проста адным з відаў спорту». «Адступленьне»—вось запраўдная характарыстыка для літаратуры буржуазнага Захаду. Адступленьне з поля бітвы ідэй, страх бескарысных (г. зн. безідэйнага) перад грамадска-карысным.

У правым крыле сучаснай французкай літаратуры квітнеюць зараз два жанры: асаблівая плынь псыхалёгічнага раману—т. зв. раман-біяграфія—і надта багатая літаратура вандраваньняў. Чаму ўзьніклі гэтыя жанры? Праблема рэалістычнага раману вельмі завострана, але самы раман у тупіку. Тканіна раману працёрлася. Раман з Анатолем Франсам заканчывае традыцыя „артыстычнага раману", эпоха прыгожага мастацтва. Марсель Пруст, адзін з найбуйнейшых французскіх мастакоў-псыхолёгаў, сваёй грандыёзнай эпапеей «У шуканьні патрачанага часу» завяршае шлях французскага псыхалёгічнага раману.

Зараз у новай французкай літаратуры няма такіх пісьменьнікаў, моц якіх была-б у сацыялёгічным базісе іхняй творчасьці. Затое ёсьць імкненьне да псыхалёгічнага аналізу інтымных перажываньняў, і гэтаму імкненьню адпавядае раман-біяграфія. Ён дае гэроеў, якіх сучаснасьць ня мае. Няма такога вялікага чалавека, пісьменьніка, музыкі, палітычнага дзеяча, вандроўца ў новыя землі, які ня жыў-бы зараз другім жыцьцём на старонках раману біяграфіі: Бальзак, Монтэль, Шопэн, Жанна д'Арк, Калюмб і г. д. Аналь што заўсёды гэрой мінулага бяжыць з інтымнага боку, творчасьць ня зьвязваецца з эпохай: французы баяцца сацыяльных матываў.

Сярод вялікай колькасьці гэтых раманаў біяграфій вызначаюцца творы Бэнжамена „Цудоўнае жыцьцё Онорэ дэ Бальзака" (цуды гэтага жыцьця ў аграмадным творчым напружаньні Бальзака), Пуртолеса — «Шопэн», Ж. Дэльтэй—«Жанна д'Арк», у якой падкрэсьлены фізіялёгічныя моманты здароўя, цела, карэньне сялянства. Прыгожа перададзены малюнкі зямлі з пахам травы, гною, малака.

Франсіс Карко прыгожа напісаў «Гаротнае жыцьцё Франсуа-Війона», сярэднявяковага паэты-брадзягі. Наогул-жа раман-біяграфія ёсьць свайго роду амаладжваньне клясычнага раману.

Другі жанр правага крыла сучаснай французкай літаратуры—лірычныя падарожжы на Ўсход. Шэраг выдатных французкіх пісьменьнікаў—Андрэ Жыд, Раман Доржэлес, Дзюамель, Люк Дэюртэн, Поль Моран, Монтэрлан, якія езьдзілі па Амэрыцы, Афрыцы, СССР і г. д.,—далі сэрыю кніг-ураженьняў: Андрэ Жыд—«Падарожжа ў Конго», Поль Моран—«Чорная магія» (пра Афрыку), Доржэлес — «Караван без вярблюдоў», Дзюамель—«Падарожжа ў Маскву», Люк Дэюртэн—«Саракавы паверх» (пра Амэрыку), Монтэрлан—„Затраўленыя вандроўнікі". Гэта, разумеецца, далёка ня ўсё, але мы пералічаем толькі галоўнае.

Монтэрлан называе сваю кнігу «Затраўленыя вандроўнікі», і гэта вельмі характэрна: з апустошанымі душамі яны шукаюць паўнату быцця ў прасторах, яны жадаюць зразумець далі. Але роспач не пакідае іх і тут: «Усе пяць частак сьвету сталі падобны адна на адну». «Усе горы—як адна гара, а мора—гэта толькі вада», кажа Монтэрлан. Поль Моран паехаў у Афрыку, каб на месцы ўбачыць прычыны вялікай цікавасьці Эўропы да нягараў, да нягрыцянскага мастацтва, рэлігіі, літаратуры. Рэвалюцыйныя ідэі, нібы маланка, праскакоць сьвядомасьць людзей—вось да чаго прыходзіць Моран у кнізе «Чорная магія». Людзі імкнуцца назад, да пачатку культуры, і вось паўстае невядомая вялікая краіна Афрыка, заселеная вялікай чорнай расай. Гэта—раса магічнай культуры. Гэта—раса „арганічнага" камунізму, і гэта нечаканае злучэньне патрэбна Эўропе, можа яе выратаваць. «Камунізм—гэта сучасная форма... энтузіязму», які патрэбен дзеля творчасьці.

Такія амаль што фантастычныя вывады робіць Моран. Такія настрої французкай літаратуры.

Менш за ўсё мы ведаем літаратуру сучаснай Англіі. Праўдзівей, мы ня ведаем яе маладую літаратуру, бо імёны Уэльса Бэрнарда Шоу, Голсуорці, Чэстэртона ў нас таксама добра вядомы, як і ў Англіі. Наогул-жа нервовыя шуканьні новых шляхоў, устраскі і ломка формаў зусім не характэрны для ангельскай літаратуры. Яна кансэрватыўна ў поўным сэнсе гэтага слова і да такой ступені, што звычайны раман Маікл Арлена «Залёны капялюш», у якім гаворыцца аб праве жанчыны на каханьне бяз шлюбу, узьняў у Англіі цэлую буру захапленьня і абурэньня. Ён напісаў востра і эфэктна, набліжаючыся па форме да Оскара Уайльда, але «бура» гэтага раману, бязумоўна, разыгралася ў шклянцы вады. Калі-ж у рамане якога-небудзь маладога аўтара закрануты палітычныя пытаньні, ня ў ружовых колерах паказваецца становішча рабочых або кулісы парляманту, дык аўтар змушан друкаваць свой твор за межамі Англіі. Так было з творам маладога пісьменьніка-рабочага Хэслопа «Пад уладай вугля», раман з жыцьця вуглякопаў, які вышаў у СССР перакладзеным з рукапісу.

Выраз „ангельскі раман" успрымаецца ў нас не як азначэньне, характарызуючае нацыянальныя асаблівасьці, але як адзначэньне літаратурнага жанру. Запраўды, векавыя непарушныя традыцыі раману ў Англіі склалі добрае, моцнае і саліднае пабудаваньне твору, моцную сюжэтную ўвязку і галярэю тыпаў, продкаў, дзядоў і бабак, якіх лёгка сустрэць у Дзікэнса.

Джон Голсуорці, адзін з буйных сучасных пісьменьнікаў Англіі, нядаўна раманам «Лебядзіная песьня» закончыў шматтомную сямейную эпапею моцнага ангельскага роду Форсайтаў—«Форсайты». У „Лебядзінай песьні" апошні з Форсайтаў памірае ў часе забастоўкі гарнякоў 1926 году, убачыўшы нагібель усіх сваіх ідэалаў. Палітыка парляманту ў часе гэтай забастоўкі змушае нават лібэральнага Майкэля Монта (мужа дачкі Форсайта—Флер) сумняваецца ў тым, ці запраўды члены парляманту выказваюць народную думку. Стары быт валіцца, гінуць ідэалы „старой вясёлай Англіі".

Па настрою да раману Голсуорці падыходзіць новая кніга Бэрнарда Шоу «Справачнік для разважлівай жанчыны па сацыялізму і капіталізму», дзе аўтар па-свойму інтымна тлумачыць сучасныя сацыялёгічныя і палітычныя праблемы. Бэрнард Шоу в тонкай іроніяй, прапітанай ядам, малюе супярэчнасьці і нятрываласьць капіталістычнай сыстэмы. У канцы разважаньняў аб няўхільнасьці войнаў, аб голадзе і беспрацоўі ён кажа: «Мы лічым сваіх абавязкаў раз у год пабляць пра мір на зямлі і ўзаемную прыязьнь у людзях, у тых самых людзях, сярод якіх матар'яльныя багацьці разьмяркованы ад паўгалоднага існаваньня да некалькіх тысяч у дзень. І ўсё гэта здабрываецца ўвешчаваньнямі пра любоў аднаго да другога. Ці можаце вы гэта пераносіць? Я асабіста не магу».

Зварот да рэалістычнага апісаньня, да псыхалёгічнага раману вастрэй за ўсё адчуваецца ў Нямеччыне, ма'быць таму, што Нямеччына так нядаўна перажывала роспвіт экспрэсыянізму. Левае крыло сучаснай нямецкай літаратуры мае выяўленыя сацыяльныя тэндэнцыі: Іоган Бэхер, Франц Юнг, Макс Дрту, Альфрэд Дэблін, Леонард Франк, Штэрнгэйм—вядомыя імёны. Грамадзкасьць, палітычныя тэндэнцыі, эканамічныя фактары, сацыяльныя матывіроўкі—асноўныя элементы новага нямецкага раману. „Артыстычны раман» тыпу твораў Тамаса Манна яшчэ жыве, але ўжо не захапляе чытача.

Рэалізм у сучасных сацыяльна-эканамічных і бытавых умовах Нямеччыны прыводзіць большасьць пісьменьнікаў да сатыры. Нават экспрэсыённы Ф. Вэрфэль, раней прасякнуты містыцызмам («Чалавек з люстэрка»—містычная трагэдыя), нядаўна даў раман «Дом журботы», псыхалёгічны і бытавы дакумант, сатырычны адбітак буржуазнага мэханічнага існаваньня.

У Нямеччыне ёсьць маладыя пралетарскія пісьменьнікі Юнг, Дорту, Курт, Клэбер і інш., якія малюць у сваіх кнігах барацьбу, перамогу і няўдачы рабочай клясы, але яны яшчэ ў стадыі дэкларацыйнай і праграмнай.

У руках-жа Карла Штэрнгэйма, Поля Морана, Бэрнарда Шоу—буржуазных аблічыцелаў капіталістычнага ладу—востра адточаная зброя сатыры, але яны нібы толькі гуляюць гэтай зброяй.

Аднак, ужо выразна відаць, што «грамадзянскі мір» у літаратуры міф. Бо няма міру ў грамадзе. Літаратура-ж—зьвяно грамадзкага жыцьця.

Пісьменьнікі пішуць кнігі. Але ня толькі аўтару належыць гонар стварэньня кнігі. Кнігі творыць эпоха і грамада, і за кнігай стаіць калектыў.

R.

РЫГОР КАЗАН.

УСПАМІН.

Мне сягоньня прыветна саўгас
Усьміхаўся бялявасьцю ліпаў.
Маладое жыцьцё, як мага
Палюбіў пад вятровыя ўсхліпы.

І старое здавалася сном,
Толькі цёплае слова ня згасла.
Успамінаў вялізарны сноп
Я скруціў залатым перавяслам.

Мне хацелася казкі хвілін
І напіцца жыцьцём, пачуцьцямі.

Твае вочы агнём зацьвілі,
Сьпеку веек ніяк ня уцяміць.
Ты казала:
— Люблю калектыў,
І працую цяпер у калоне.
Бачу ў працы і ты не астыў,
Бо гадуеш багатыя руні.

Я цішком паглядаў на цябе,
Ты піла малако і румянец
І цяпер весялосьці разьбег
На высокіх грудзёх не завяне.

Не забудуцца песьні вясны,
Босаногая радасьць і росы.
Загарэліся мары і сны,
І хісталіся русыя косы.

Памятаеш,—
Гарэзьліва мы
На уруг выганялі каровы.
І пад лісьцем аквечаных ліп
Асьвяжалі гарачыя бровы.

А цяпер
Успамінаў сноп
Закруціў залатым перавяслам.
Ты казала:
— З табою даўно...
Гэта цёплае слова ня згасла.

Бываюць і такія „крыцікі".

Лишен чутья,
А всем судья!
Н. АСЕЕВ.

Ніхто ня будзе адмаўляць, што ў творчасьці некатарых нашых маладых пісьменьнікаў ёсьць моманты посымізму і ўпадніцтва. Але, часам, бывае, што той ці іншы крытык стараецца «напустить» на пісьменьніка гэтыя прыгожасьці, часта метадам гвалтоўнага вырываньня асобных, нічым ня зьвязаных радкоў.

Перад намі артыкул Р. Кр-скага «Поэма адзінства і раздарожжа», зьмешчаны ў газэце «Зьвязда» 7 сакавіка г. г. Аўтар, разглядаючы начатак паэмы, Валерыя Маракова, зьмешчанай у «Полымі» № 1, не сумняваючыся ні на хвіліну, горача хапае цытату за цытатай і абвінавачае В. Маракова ў «надрыўным пэсымізьме», «антаганізьме з жыцьцём» і г. д. і г. д.

Паглядзім, як тлумачыць аўтар артыкулу наогул, прычыны пэсымізму ў нашых маладых поэтаў: «Адсутнасьць акрэсьленага сьветапогляду, неразуменьне эпохі» і г. д.

Далей аўтар разглядае паэму Валерыя Маракова і самога паэту, як канкрэтнага насіцеля пэсымізму і ўпадніцтва. Вось тут аўтар і паказаў сваё няўменьне падыходзіць да твору. Сапраўды, хто можа адважыцца ўзяць каволачак з вялікага твору В. Маракова, і сьцьвярджаць, што аўтар „адарваўся ад рэчаістасьці", «ня чуе крыку жыцьця», «ня зьбіраецца наблізіцца да жыцьця».

Гэта першая памылка аўтара артыкулу. Далей Р. Кр-скі бярэ асобныя радкі з памянёнай паэмы і вершаў Маракова, якія друкаваліся тры гады таму назад («Пялёсткі») і стараецца давесьці, што паэта пэсымісты.

Мы ня думаем адмаўляць тое, што В. Маракоў калісьці хварэў пэсымізмам. Гэта перыяд «Пялёстак». З часу-ж выхаду «На залатым пакосе», Маракоў рэзка павярнуў у бок апяваньня нашай рэчаістасьці, і наблізіўся сваёй творчасьцю да пралетарскай. І нарэшце, цяперашняя творчасьць паэты стаіць зусім блізка да пралетарскай («Аднаўленая зямля», «Сако і Ванцэці»).

Але факт той, што Р. Кр-скі вельмі далёкі ад крытычнага падыходу да твору. Ён нават не зразумеў зьместу першай часткі паэмы і, таму мабыць, так шчыра крычыць аб тым, што ў маладых паэтаў няма «акрэсьленага сьветапогляду».

У тым і ўся справа, што Р. Кр-скі, неразумеючы сэнсу пачатка паэмы Маракова прышоў да нэтаду набору радкоў з розных вершаў і паэмы і паэты і, такім безпадстаўным сафізмам, калі так можна сказаць, абвінаваціў Маракова ў пэсымізьме.

Р. Кр-скі знаходзіць пэсымізм у такіх радкох:

Вецер, вецер!
Як сэрца забіла трывогу,
Гэта свой, ці мо гэта чужы...

і кажа, што ледзяным холадам абдае ад гэтага ветру. Думаю, што кожны пісьменны чалавек разумее, што гэныя вобразы далёка не заўсёды выражаюць упадніцкія настроі. Наадварот, гэта вельмі добра было-б, каб усе паэты разьбіраліся: «Гэта свой, ці мо гэта чужы».

Многа ў нас ёсьць чужых!

Далей Р. Кр-скі выхватвае асобныя вобразы: «чорнай восені сум», „сумныя песьні бяроз" і гэта ўсё, судзячы па вобразах, даводзіць, што Бел. АПП'авец Маракоў упаднік. На самай справе, калі Р. Кр-скі не разумее зьместу, а дрывак паэмы выражае наступнае: Сам аўтар ідзе ў вёску да свае бабулі. Вецер. (Думаю, што вецер гэта ні ўпадніцтва, т. Р. Кр-скі, а нармальная прыродная зьява!). Аўтару ўспамінаецца якраз такая-ж ноч з ветрам і бурай Кастрычніку і папярэдніцы яго імпэрыялістычнай вайной і паэту становіцца сумна. А сумна паэту не таму, што бура Кастрычніка многа старога разбурыла і „абарвала дамы і капліцы", а таму, што:

Абсыпаліся рукі дзявочых грудзей,
Вочы доўга глядзелі на захад,
Дзе гарматнае мяса каханых людзей
Пажыралі галодныя птахі...

Думаю, што ўсім зразумела, што гаворыцца тут аб імпэрыялістычнай вайне.

І далей:

Праз жыцьцёвую сьцюжу, праз змрок
і туман,
Толькі вецер над полем,
Як п'яны хістаўся
І хварэла душа ад нацёкаў і ран...

Гэта-б вы, т. Р. Кр-скі, непачытаўшы наступнай страфы, прынялі-б таксама за пэсымізм. Дык чытайце аб прычынах «нацёкаў ран»:

Выццам нехта ў апошні, прадсьмертны свой час
Уваў і выхапіў сонца з туманных вышынь,
Каб прымусіць паўстаўшых баяцца маўчаць,
І каб іншых душыць,
І душыць,
І душыць...

Вось чаму Маракоў „за шлях пражытага крыўдна" і яму шле паэта праклён. Будзем сачыць за зьместам далей: Туман і бура ночы разьвейваецца, пачынае сьвітаць у прыродзе і ў настроях паэты. Тут ужо ў гутарцы з бабуляй, Маракоў выказвае свае сьветлыя погляды на жыцьцё.

— Эх, бабуля!
Я знаю ня ўсё тут расказана,
На жыцьцё я па іншаму гляджу,
Ня з душой дармаеда,
Ні ката, ні блазна...
Гэта сон счаравуў, лепш табе раскажу я,
(Сёньня хочацца сэрца сваё расказаць),
Як на трупах
Жывых яшчэ і мёртвых буржуяў
Пачынаем мы шчасьце сваё будаваць...

Бачыце, аб чым Маракоў расказвае бабульцы! Здавалася-б, зусім ясны прыём псыхалёгічнай адпаведнасьці ў настроях Маракова з прыродай і толькі ід

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Цэнтральн. Выканаўчага Камітэту БССР

аб зьменах у складзе Вярхоўнага Суду БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Адкліканьне тав. Зыбко, Ігната Вінцэнтавага, са складу Вярхоўнага Суду БССР ажалабаніць яго ад абавязкаў Старшыні грамадзянска-Касацыйнай Калегіі Вярхоўнага Суду БССР.

2. Назначыць члена Вярхоўнага Суду БССР тав. Штэсра, Сьпянава Сьпянавіча, Старшынёй Грамадзянска-Касацыйнай Калегіі Вярхоўнага Суду БССР.

3. Назначыць членамі Вярхоўнага Суду БССР т. т. Астроўскага, Канстанціна Васілевіча і Гінзбурга, Уладзімёра Григоравіча.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР У. Ігнатоўскі.

23 сакавіка 1929 г
г. Менск.

ПАСТАНОВА

САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

пра зацьверджаньне палажэньня пра ўсебеларускі конкурс на лепшы па сельскай гаспадарцы райён БССР.

У развіцьцё свае пастановы за 3 лістапада 1927 году «Пра ўсебеларускі конкурс на лепшы па сельскай гаспадарцы райён» (З.З. БССР 1927 г., № 44, арт. 236) Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Зацьвердзіць Палажэньне пра ўсебеларускі конкурс на лепшы па сельскай гаспадарцы райён БССР.

2. У сувязі з правядзеньнем конкурсу павінна быць арганізавана на ўсёй БССР сыстэматычная праца для прапаганды і высьвятленьня сярод шырокіх колаў насельніцтва задач конкурсу і шляхоў вырашэньня іх.

Да гэтай працы павінны быць прыцягнуты, апроч земельных установаў, мясцовы друк, органы палітасьветы, сельска-гаспадарчая кааперацыі, прафесыянальныя і іншыя грамадзкія арганізацыі і бядняцка-серадняцкі сялянскі актыў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Справаў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

20-га сакавіка 1929 г
гор. Менск.

ПАЛАЖЭНЬНЕ

пра ўсебеларускі конкурс на лепшы па сельскай гаспадарцы райён БССР.

I. ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ.

1. У агульныя задачы ўсебеларускага конкурсу на лепшы па сельскай гаспадарцы райён уваходзяць:

1) заахвочваньне сялянства ў развіцьці сельскай гаспадаркі цэлых райёнаў;

2) узмацненьне актыўнасьці ўсіх зямельных і іншых савецкіх органаў, а таксама кааперацыйных органаў у справе арганізацыі і правядзеньня мерапрыемстваў для развіцьця сельскай гаспадаркі ў раёнах;

3) выяўленьне і вывучэньне спосабаў і вынікаў найбольшых сельска-гаспадарчых дасягненьняў у сельскай гаспадарцы цэлых райёнаў пры ўлоўнае гаспадарчых, культурных і бытавых умовах;

4) папулярызацыя сярод шырокіх мас сялянства і ўсіх установаў і арганізацый, што працуюць у галіне дапамогі сельскай гаспадарцы БССР, вынікаў найбольш рацыянальнага вядзеньня сельскай гаспадаркі ў спасобных раёнах БССР.

2. У гаспадарчыя задачы конкурсу ўваходзяць:

а) індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі, павялічэньне вытворчага кааперавання насельніцтва, асабліва бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак, праз павялічэньне і ўзмацненьне кааперацыйных аб'яднаньняў вытворчага тыпу, напрыклад: для перапрацоўкі і збыту прадуктаў малочнай гаспадаркі (малочныя, маслабойна-сыраварныя таварыствы), для палепшаньня насеньня (насенныя таварыствы), для забясьпечаньня насельніцтва сельска-гаспадарчымі машынамі (машынныя таварыствы), для палепшаньня жывёлагадоўлі (кантрольныя таварыствы, заводзка-жывёлагадоўчыя таварыствы), для палепшаньня садоўніцтва (садова-гародныя таварыствы), для пашырэньня кармовай плошчы і плошчы сельска-гаспадарчага карыстаньня (мэліяцыйныя таварыствы), для палепшаньня гаспадарак наогул (насяковыя таварыствы) і інш.;

б) павялічэньне колькасьці і ўзмацненьне дзейнасьці калектыўных аб'яднаньняў праз рацыянальнае вядзеньне гаспадарак, правядзеньне ў калектыўных гаспадарках поўнай калектывізацыі і ўзмацненьне сувязі калектыўных гаспадарак з суседнім насельніцтвам;

в) павялічэньне таварнасьці масавай сялянскай гаспадаркі праз развіцьцё больш таварных галін гаспадаркі (сьвінарства, малочнай гаспадаркі, прамысловага садоўніцтва), пашырэньне пасеву больш таварных культур, асабліва тэхнічных (лён, канопля), пашырэньне сеткі кааперацыйных пунктаў, заводаў для перапрацоўкі сыраў, арганізацыю і пашырэньне кааперацыйнага збыту прадуктаў сельскай гаспадаркі;

г) вырашэньне кармовага пытаньня ў масавых сялянскіх гаспадарках раёну праз павялічэньне палявога травасеяньня, пасеў коранаплодаў, палепшаньне сенажаньня і выгадаў, арганізацыю кааперацыйнага забясьпечаньня гаспадарак моцнымі кармамі;

д) павялічэньне ўраджайнасьці палёў, садоў, гародаў, сенажаньня праз масавых агрыкультурных палепшаньняў у гаспадарках, напрыклад: павялічэньне пасеваў лубіну на ўгнаеньне, ужываньне штучных угнаеньняў і торфу на ўгнаеньне, пасеваў сартаваным, палепшаным і гатункова насеньнем, своечасную і дасканалую апрацоўку глебы, ужываньне рацыянальных шматпалёвых севазваротаў і належнага догляду за культурамі, арганізацыю сыстэматычнага змаганьня з шкоднікамі і інш.;

е) павялічэньне прадукцыйнасьці мясцовай жывёлы, асабліва буйнай рагатай жывёлы і сьвіней праз пашырэньне сеткі племянных і палепшаных вытворнікаў, палепшаньне ўмоў кармленьня, утрыманьня і догляду за жывёлаю на падставе павялічэньня кармовых запасаў у гаспадарках насельніцтва і належнай арганізацыі рынку збыту прадуктаў, у спасобку праз малочную кааперацыю.

II. АРГАНІЗАЦЫЯ КОНКУРСУ.

3. Конкурс зьяўляецца ўсебеларускім. У конкурсе могуць удзельнічаць усе раёны БССР, не залежна зд іх цяперашняга гаспадарчага становішча і разьвіцьця ў іх у цучасны момант зямельнай і кааперацыйнай працы.

4. Конкурс пачынаецца з 1 красавіка 1929 году і канчаецца 1 верасьня 1930 году.

5. Агульнае кіраваньне правядзеньнем конкурсу ў БССР ускладаецца на Цэнтральную Конкурсную Камісію пры СНК БССР, для спасобных округ—на акруговыя конкурсныя камісіі пры акруговых выканаўчых камітэтах.

6. У склад Цэнтральнай Конкурснай Камісіі ўваходзяць: прадстаўнік Народнага Камісарыяту Земляробства, Цэнтральнага Статыстычнага Кіраўніцтва, Белсельсаюзу, Белсельбанку, Саюзу Сельска-Гаспадарчых і Лясных рабочых, Цэнтральнага Камітэту Сялянскіх Таварыстваў Узаемадапамогі, Белкалгасасаюзу і сляне—па прадстаўленьню Народнага Камісарыяту Земляробства.

У склад акруговых конкурсных камісій уваходзяць: старшыня акруговага выканаўчага камітэту, загадчык зямельнага аддзелу акруговага выканаўчага камітэту, старшыня акруговага сельска-гаспадарчага саюзу, старшыня акруговага таварыства сельска-гаспадарчага крэдыту, старшыня акруговага аддзелу прафесыянальнага саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых, прадстаўнік камітэтаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі.

7. У раёнах, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, пры раённых выканаўчых камітэтах утвараюцца асобныя раённыя камісіі для дапамогі правядзеньню конкурсу ў складзе: прадстаўніка ад раённага выканаўчага камітэту, раённага сельска-гаспадарчага крэдытнага таварыства, раённага камітэту таварыстваў сялянскай узаемадапамогі.

8. Паводле пастаноў выканаўчага камітэту раёнаў, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, пры сельскіх саветах могуць утварацца спэцыяльныя камісіі з прадстаўнікоў сельскага савету, кааперованага насельніцтва і камітэту сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі.

9. У склад конкурсных камісій могуць запрашацца прадстаўнікі іншых установаў і арганізацый на прапанове камісіі.

10. Члены Цэнтральнай Конкурснай Камісіі зацьвярджаюцца Саветам Народных Камісараў, акруговых камісій—акруговымі выканаўчымі камітэтамі, раённых і сельскіх—раённымі выканаўчымі камітэтамі.

11. Парадак дзейнасьці конкурсных камісій устанаўляецца асобнаю інструкцыяю Савету Народных Камісараў БССР.

12. Камісіі свайго спэцыяльнага тэхнічнага апарату не маюць. Усе бягучыя тэхнічныя працы для правядзеньня конкурсу ускладаецца на апарат зямельных установаў: Народнага Камісарыяту Земляробства, зямельнага аддзелу акруговага выканаўчага камітэту і зямельнай часьці раённага выканаўчага камітэту.

III. ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕНЬНЯ КОНКУРСУ.

13. Райёны, які хоча ўдзельнічаць у конкурсе, павінен падаць не пазьней 1 красавіка 1929 году праз раённы выканаўчы камітэт пісьмовую заяву ў акруговую конкурсную камісію, на падставе адпаведнай пастановы раённага выканаўчага камітэту, або пашыранага пленуму раённага выканаўчага камітэту, абавязкова абмеркаваўшы пытаньне аб удзеле ў конкурсе на агульных сходах у сельскіх саветах раёну.

Акруговыя конкурсныя камісіі пасьля атрыманьня заяў ад раёнаў, якія хочуць удзельнічаць у конкурсе, пасылаюць сьпіс гэткіх раёнаў у Цэнтральную Конкурсную Камісію да ведамы.

14. З 1 чэрвеня да 1 верасьня 1929 году стан тых раёнаў, якія будуць удзельнічаць у конкурсе (арт. 13), апісваецца паводле зацьверджанай Цэнтральнаю Конкурснаю Камісіяю праграмы.

Апісаньні робяцца асобамі, падрыхтаванымі для гэтай працы, якія спэцыяльна запрашаюцца для паказанай мэты акруговымі конкурснымі камісіямі пасьля ўгадненьня з Цэнтральнаю Конкурснаю Камісіяю.

15. Зробленыя апісаньні раёнаў з заключэньнем аб іх раённых выканаўчых камітэтаў пасылаюцца ў акруговую конкурсную камісію, якая пасьля ўнясэньня ў патрэбных выпадках паправак і зацьверджаньня пададзеных апісаньняў раёнаў пасылае іх у Цэнтральную Конкурсную Камісію. Копіі апісаньня пакідаюцца ў справах акруговай камісіі.

16. У парыяд конкурсу мерапрыемствы ў галіне сельскай гаспадаркі ў раёнах, што ўдзельнічаюць у конкурсе, ажыцьцяўляюцца ў звычайным парадку планавай працы зямельных і кааперацыйных органаў.

Сродкі ў гэтых раёнах у сувязі з конкурсам могуць павялічвацца толькі для бядняцкіх гаспадарак у парадку атрыманьня спэцыяльнага льготнага крэдыту, які даюцца на тых-жа падставах, як і крэдыт з фонду беднаты. Разьмер патрэбных дадатковых сродкаў па округах і раёнах вызначаецца акруговымі конкурснымі камісіямі разам з акруговымі пляновымі камісіямі і зацьвярджаецца цэнтральнай конкурснай камісіяй на падставе заключэньня Дзяржаўнай Плянавай Камісіі.

17. У канцы конкурснага парыяду з 1 чэрвеня да 15 жніўня 1930 году апісваюцца другі раз і такім самым парадкам усе тыя раёны, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, паводле памянёнай вышэй праграмы.

У гэтых паўторных апісаньнях асабліва падрабязна распрацоўваецца матар'ял, які адбіває ўсе станоўчыя зьмены ў стане сельскай гаспадаркі раёну і вынікі праробленай працы па разьвіцьці сельскай гаспадаркі ў параўнаньні з пачаткам конкурснага парыяду.

Парадак накіраваньня паўторных апісаньняў раёну ў Цэнтральную Конкурсную Камісію аетасецца такім-жа, які быў вызначаны вышэй для першых апісаньняў у пачатку конкурснага парыяду.

18. На падставе пастуціўших апісаньняў у пачатку і ў канцы конкурснага парыяду Цэнтральная Конкурсная Камісія дае ацэнку ўсіх дасягненьняў у раёнах, якія ўдзельнічалі ў конкурсе.

19. У ацэнку дасягненьняў раёнаў, што ўдзельнічаюць у конкурсе, павінны ўваходзіць гаспадарчыя вынікі працы зямельных, кааперацыйных, грамадзкіх установаў і арганізацый раёну і самага насельніцтва на працягу конкурснага парыяду ў разьвіцьці сельскай гаспадаркі.

Па ўсіх раёнах, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, павінны ацэньвацца вынікі працы па наступных мерапрыемствах:

а) па каапераваньні і калектывізацыі насельніцтва;

б) па ўвядзеньні шматпалёвых севазваротаў;

в) па мэліярацыі і культур-тэхніцы;

г) на ўнутрыпасельным землеўпарадкаваньні і асабліва па арганізацыі пасёлкаў;

д) па разьвіцьці прадукцыйнай жывёлагадоўлі;

е) па разьвіцьці прамысловага садоўніцтва;

ж) па індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі.

20. Пры ацэнцы вынікаў працы асобна павінна ацэньвацца праца, зробленая на ініцыятыве і пры ўдзеле сродкаў насельніцтва і грамадзкіх установаў вёскі, у спасобку па арганізацыі шматпалёвых севазваротаў бяз удзелу земляўпарадчыкаў, па асушцы і на гаспадарчым скарыстаньні забалочаных плошчаў, па разьвіцьці ўжываньня мясцовых угнаеньняў (торф, попел), па разьвіцьці і ўзмацненьні сеткі кааперацыйных аб'яднаньняў вытворчага тыпу, асабліва ў галіне жывёлагадоўлі, палепшаньня насеньня і інш.

21. Пры ацэнцы вынікаў працы павінны быць узяты пад увагу спэцыяльныя сродкі, выдзеленыя некаторымі райёнамі на працягу конкурснага парыяду, на падставе спэцыяльных пастаноў дырэктыўных органаў, напрыклад: ільнаводным і пагранічным райёнам.

22. Пры ацэнцы гаспадарчых дасягненьняў раёнаў, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, павінны абавязкова ўлічвацца наступныя паказчыкі:

а) ураджайнасьць галоўных палявых культур, садоў і сенажаньў;

б) зьмены ў разьмеркаваньні пасеўных плошчаў раёну на пасобныя культуры;

в) кармавая забясьпечанасьць раёну;

г) зьмены ў стане жывёлагадоўлі (колькасьць і склад жывёлы);

д) агульны даход сельскай гаспадаркі раёну;

е) таварнасьць сельскай гаспадаркі раёну.

Падрабязны парадак мерапрыемстваў і паказчыкаў гаспадарчага ўлоўнаю, на якіх будзе рабіцца ацэнка гаспадарчых дасягненьняў па асобных групах раёнаў, вызначаецца Цэнтральнаю Конкурснаю Камісіяю паводле прапановы Народнага Камісарыяту Земляробства.

IV. ПАРАДАК ВЫЗНАЧЭНЬНЯ ПРЭМІЙ І СКАРЫСТАНЬНЯ ІХ

23. На падставе ацэнкі гаспадарчых дасягненьняў Цэнтральная Конкурсная Камісія большасьцю галасоў прысуджае прэмію тым раёнам, якія маюць найбольшыя гаспадарчыя дасягненьні у выніку праўленьня ініцыятывы і самадзейнасьці самім насельніцтвам праз масавае вытворчае каапераваньне і калектывізацыю.

24. Усіх прэмій вызначэнца 21 на агульную суму 425.000 рублёў і разьмяркоўваюцца яны гэтак:

1 прэмія I ступені на суму 75.000 руб.,
2 прэміі II ступені па 50.000 руб.,
3 прэміі III ступені па 25.000 руб.,
5 прэмій IV ступені па 15.000 руб.,
10 прэмій V ступені па 10.000 руб.

25. Вызначэнні конкурсу павінны быць абвешчаны і прэміі раёнам павінны быць выданы не пазьней 1-га кастрычніка 1930 году.

26. Атрыманыя раёнамі прэміі могуць быць скарыстаны на мэты далейшага разьвіцьця сельскай гаспадаркі і для прэміраваньня пасобных калектыўных гаспадарак перадавых пасёлкаў, вёсак, гасцінарак, грамадзкіх арганізацый і установаў, найбольш актыўных спрыяльнікаў сельскай гаспадаркі і асобных актыўных працаўнікоў раёну.

27. Пасьля скавчэньня конкурсу Цэнтральная Конкурсная Камісія выдае спэцыяльны зборнік з матар'ялам конкурсу.

28. Матар'ялы конкурсу перадаюцца Цэнтральнаю Конкурснаю Камісіяю Народнаму Камісарыяту Земляробства для далейшага іх скарыстаньня ў практычнай працы зямельных органаў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Справаў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

20 сакавіка 1929 г.
г. Менск.

Пастанова

Эканамічнае Нарады пры СНК БССР

пра скарыстаньне сялянскага гужавога транспарту.

У мэтах паляпшэньня перавозкі будаўнічых матар'ялаў і іншых дажараў—Эканамічная Нарада пастанаўляе:

1. Запрапанаваць усім даржаўным, кааперацыйным і грамадзкім установам, арганізацыям і прадпрыемствам максымальна скарыстоўваць сялянскі гужавы транспарт для перавозкі будаўнічых матар'ялаў і іншых дажараў.

2. Абавязаць паказаныя ўстановы і арганізацыі пры найманьні сялянскага транспарту не дапускаць канкуранцыі паміж сабой і зьвяжанага з ёй падвышэньня перавозачнай платы, якая ўстаноўлена для данага райёну.

3. Рэгуляваньне ставак перавозачнай платы ўскладзі на акруговыя выканаўчыя камітэты, а нагляд за выкананьнем гэтай пастановы—на раённыя выканаўчыя камітэты і сельскія саветы.

Старшыня Эканамічнае Нарады при СНК БССР М. Карклін.

Нам. Кіраўніка Справаў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР В. Крывіцкі.

19 сакавіка 1929 г.,
г. Менск.

У Эканамічнай Нарадзе БССР.

АБ ФОНДАХ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ БЕДНАТЫ.

У мэтах палягчэньня для ўступаючых бядняцкіх гаспадарак і батракоў у калектыўныя гаспадаркі (сельска-гаспадарчыя камуны, сельска-гаспадарчыя арцелі і таварыствы па грамадзкай апрацоўцы зямлі) Эканамічная Нарада прызнала мэтазгодным утварыць спэцыяльныя фонды калектывізацыі бядняцкіх гаспадарак і батракоў, у зьвязку з чым прынята Палажэньне, якое садзейнічае прыдзяленьню гэтага мерапрыемства.

АБ СРОДКАХ НА ПАБУДАВАНЬНЕ ХЛЕБАЗАВОДАЎ.

При разгляданьні пытаньня аб фінансаваньні пабудовы хлебазаводаў Эканамічнай Нарадай пастановлена разьмяркаваць 220.000 рублёў з фонду ОДК паміж наступнымі округамі: Гомелю—50.000 руб., Віцебску—110.000 руб. Бабруйску—40.000 руб., Воршы—15.000 руб. і Рэчыцы—5.000 рублёў.

АБ МАБІЛІЗАЦЫІ ЎНУТРАННЫХ РЭСУРСАЎ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР.

Значныя запасы сыраў і паўфабрыкатаў на прадпрыемствах ВСНГБ, у некаторых выпадках зусім непатрэбныя для нармальнага ходу іх працы, замаруджалі тэмп абароту капіталаў прамысловасьці.

З мэтаю адхіленьня гэтай ненармальнасьці ВСНГ БССР пачала праца па мабілізацыі ўнутранных рэсурсаў прамысловасьці.

ЭКАМА заслухала даклад Прэзыдыуму ВСНГ па гэтаму пытаньню.

Дадзены дырэктывы зьвярнуць асаблівую ўвагу на паскараньне і актывізацыю гэтай працы трэстамі і асобнымі прадпрыемствамі, даручана зьвярнуць увагу і на нармалізацыю запасаў матар'яльных каштоўнасьцяў у асобных прадпрыемствах, імкнучыся да ўстаноўленьня больш жорсткіх лімітаў, чым гэта было прадугледжана прамфінпланам. Адначасова з гэтым ВСНГ павінен тэрмінова даць адпаведныя дырэктывы па лініі мясцовай прамысловасьці наконт мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

ХРОНІКА.

За зрыў загатовак—пад суд.

Слабае выкананьне плану хлебазагатовак па Менскай акрузе тлумачыцца непэкай працай на мясцох працаўніцкай кааперацыі і райвыканкомаў.

Сотні недарэчнасьцяў, нядбайных адносін і злачынстваў—не пералічыш. Ёсьць выпадкі, калі кааператары скажалі нанесаную лінію на вёсцы, даючы па цьвёрдай цане хлеб кулаком і гандляром.

Моцны заможнік падкапіўся да старшыні Прылепскага спажыўтаварыства, Баруўскага.

Узяў яго пад свой уплыў і сумесна пачалі рабіць злачынствы.

— Ведаць ня будзе ніхто... Рэч выгадная... Пяцьдзесят пудзінаў збожжа па цьвёрдай цане, а мы... мы... яго па 3-4 рублі шпульнём.

Выгадна... Ведаць ня будзе ніхто...

У Баруўскага ўскружылася галава. Пяць дзесят на чатыры... дзьвесьці. І ён пытаньне ўладжае.

Старшыня сельсавету Дзядовіч заможнікам узбройвае дзеваньк: „САЦЫЯЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА—БЯДНЯК“.

Перашкод няма, кулаку поўны доступ. Ён атрымлівае 45 пудоў хлеба па цьвёрдай цане ў спажывецкім таварыстве.

Зараз Баруўскі і Дзядовіч зьняты з працы і аддадзены пад суд.

Па пастанове прэзыдыуму Менскага АВК за невыкананьне плану хлебазагатовак, за недбайствы і злачынствы прыцягнуты да адказнасьці сябры праўленьня Дзешчынскага і Дудчыцкага спажывецкіх таварыстваў.

Старшыня праўленьня Астрашыцка-Гарадзецкага спажывецкага таварыства Батковіч зьнят з працы. Праўленьню Тальчэўскага спажывецкага таварыства вынесена вымова. Гэта некалькі прыкладаў нядбайства і злачынства.

Батракоў—у вайсковыя школы.

ЦК саюзу сельгасрабочых разаслаў дырэктыву, каб кожны рабочы падрыхтаваў аднаго батрака для паступленьня ў вайсковыя навучальныя ўстановы. Падрыхтоўка батракоў павінна праводзіцца як групамі, так і індывідуальна. Да падрыхтоўкі будуць прыцягнуты настаўніцтва і спэцыялісты па сельскай гаспадарцы. На падрыхтоўку кожнага батрака адпускаецца па 25 р.

Рабочы - вынаходца.

Рабочы лесазаводу імя Томскага ў Рэчыцы т. Фінкельберг зрабіў вельмі каштоўную вынаходку—мэхэнічны лесапагружальнік. Бюро садзейнічаньня рабочаму вынаходзтву пры ВСНГБел. выслала т. Фінкельбергу 100 руб. на складаньне чарцяжоў вынаходкі.

Вывучэньне стану ФЗВ і прафтэхшкол.

Калегія Наркамасьветы пастанавіла правесьці ўсебеларускі агляд-смотр школ фабзавуча і прафтэхнічных школ.

Агляд будзе праводзіцца ў парыяд з 1 красавіка да 15 мая і ставіць сваёй мэтай вывучэньне становішча гэтых навучальных устаноў.

Пасьля агляду будзе склікана спэцыяльная нарада кіраўнікоў школ фабзавуча і прафтэхнічных школ для абгаварэньня вынікаў агляду.

Падрыхтоўка батрацтва ў ВНУ.

Сэлета будзе прынята ў рабфакі 100 батракоў, з якіх 60 будуць падрыхтоўвацца пры Віцебскім рабфаку, які адчыняецца 1-га мая, рошта 40 чалавек будуць падрыхтоўвацца на месцах.

УНОСЯЦЬ І ВЫКЛІКАЮЦЬ.

Мы, група студэнтаў рабфаку БДУ, у ліку 5 асоб, уносім у шэфтаварыства рабфаку БДУ на карысьць калектывізацыі бяднейшага сялянства падшэфнага Грычынскага с.-с. 51 руб. 50 кап. і выклікаем наступных таварышоў:

Лойка Шыляева, Парука, Нікольскага, Тэпіна, Пліса, Драбніна, Астроўскага, Пратасэвіча, Пранофьева Кугеля Р. А, Кугеля Р. Я., Казлова Івана, Цвырка-Гадыцкага, Лаўковіча, Сімановіча Г. Д., Раждзесьцьвенскага, Валаовіча, Мініна, Скобелева, Рохліна Я., Едзідовіча, Паўлюкевіча, Лебедзя, Кохамскага, Чабана І., Гурвіча А. Л., Кандыдаву, Рытар І., Кухто, Пінуе, Гусеву, Драка, Кагана А., Рудніцкага, Малеева, Старасьвецкага, Прыстойку і наогул усё студэнтва, настаўніцтва і прафсоюру ўсіх факультэтаў БДУ.

Студэнты рабфаку БДУ: Царык, Хлеўнер, Аямана, Арыніч, Верам'оў.

Тав. Ошарава не вінавати.

20-га сакавіка гэтага году ў «Сав. Бел.» была надрукавана заметка пад загалоўкам „У ВНУ ідуць сакулянты і духоўнікі“ у якой паведамлялася, што дашкольны інспэктар т. Ошарава накіравала для работы ў Чэрвенскі дзіячы дом варожы элемэнт, несяброў саюзу, якіх праводзіла ў сябры саюзу і спрыяла іх паступленьню ў ВНУ. У прыклад узята Галавенчык. На аснове прадстаўленых дакумэнтаў высьвятлялася, што факты, паказаныя ў заметцы, не пацьвердзіліся.

Галавенчык была прынята на службу ліпэ ў 1927 г., а т. Ошарава працуе на пасадзе інспэктара з лютага 1928 г. Накіраваньне туды трох асоб несяброў саюзу было зроблена інспэкцыяй са згодай ЦК саюзу працасьветы з прычыны адсутнасьці на біржы працы дашкольніц—сяброў саюзу, якія-б жадалі выехаць на працу ў правінцыю.

У газэты таксама гаварылася, што загадчыца дзіцячага дому т. Трубенок „ня з простых“, на справе-ж Трубенок вызьлецца дачкою лістаноша, скончыла рэфак і на работу сябе апраўдала.

Бюро расьсьледаваньня „Сав. Бел.“.

Лісты ў рэдакцыю.

Паважаны т. рэдактар!

Дазвольце праз вашу газэту выказаць маю шчырую падзяку арганізатарам літаратурна-мастацкага вечара (аб'яднаньню пісьменьнікаў—Полыня) прысьвечанага маёй літаратурнай і тэатральнай дзейнасьці, а таксама і ўсяму грамадзтву, якое прысутнічала на гэтай урачыстасьці, якое аддало належную ўвагу маёй працы і працы калектыву вандроўнага тэатру.

Галубок.

Паважаны т. рэдактар.

Не адмоўце зьмясьціць у вашай газэце наступнае: гэтымі днямі ў газэтах і па гораду абвяшчалася аб вясельнім бале, наладжваемым Домам Працасьветы. Каб ня было непаразуменьняў з боку сяброў Дому і саюзу, тлумачыцца, што баль наладжваў ня Дом, а МК газэты „Рабочай“ на карысьць шэфтаварыства. Дом толькі прадаставіў памяшканьне.

Загадчык Дому Мароз.

НАВУКА І ТЭХНІКА.

Савецкая электрапечы.

Увоз электрычных вырабаў у СССР з-за мяжы за апошнія часы значна скараціўся дзякуючы буйным посьпехам савецкіх заводаў даржаўнага электрэтрэсту. На Волхаўстрой ужо другі год з посьпехам працуюць савецкія генэратары магутнасьцю па 10.000 конскіх сіл. Для Дняпрэстрою будуць зроблены генэратары па 50.000 сіл.

Зараз пачаўся выпуск савецкіх электрапечаў і апаратаў для электразваркі. Электрапечы патрабны для плавкі і пераплаўкі сталі высокай якасьці і іншых металяў і маюць вялікія пераваг перад звычайнымі спосабамі плаўкі ў цёплавых печах.

Можна палічыць зьвыш 40 відаў электравырабаў, якія раней выпісваліся з-за мяжы, а зараз іх даюць савецкія заводы.

Нямецкая тайна раскрыта.

У вялікай тайне крыецца новае дасягненьне нямецкай тэхнікі—здабываньне бэнзіну з нафтапрадуктаў пасьля награваньня іх пры высокім ціску. Спробы наладзіць гэту новую вельмі важную галіну нафтапрамысловасьці на савецкіх промыслах давалі ўвесь час незначныя вынікі, бо пры гэтым зьвыш паловы нафтапрадуктаў ператварэлася ў малакаштоўны кокс.

У Хімічным інстытуце Акадэміі Навук СССР ставіліся вопыты атрыманьня бэнзіну з нафтапрадуктаў з дапамогай газу вадароду. Гэтыя вопыты далі незвычайна каштоўныя вынікі; з грозненскага парафіністага мазуту вышла да 40 процантаў бэнзіну, 30 процантаў карасіны і 20 проц. жыдкага нафтавалу; коксу ўсім ня вышла.

Такім чынам, тайна нямецкай нафтапрамысловасьці раскрыта, і гэта дасьць агромадную карысьць для нашай гаспадаркі.

Прапэлер запальвае агні.

Ноччу авіатару не заўсёды бывае лёгка знайсьці аэрадром. Часам самалёт кружыцца, ня маючы поўнага напрамку да месца спуску.

За мяжой адбываюцца вопыты з аўтаматычным запальваньнем сігнальных агнёў у розных месцах каля аэрадрому. Гэтыя агні будуць паказваць шлях да месца спуску.

Агні запальваюцца толькі тады, калі падалёка пралятае аэраплян і чуцен шум прапэлера. Гэты шум успрыймецца мікрафонам, які зьвязан з мэханізмам, замыкаючым і размыкаючым ток у аўтаматычным выключальцы. Вопыты даюць добрыя вынікі.

Мэталь, які не праводзе цяпла.

Часта бывае, што пажадана мець мэталёвыя вырабы, не праводзячыя, або слабо праводзячыя цяпло. Напрыклад, ручкі посуды, ручкі дзьвярэй, пасобныя часткі машын, струматы для працы з кислотамі рэчамі і г. д.

За граніцай кідаўна такі мэталь удалося здабыць: гэта—сплаў з жалеза (64 проц.), нікеля (35 проц.) і хрому (1 проц.).

Вопыты з ім паказалі, што яго цяпла-праводнасьць зусім мала большая за цяпла-праводнасьць дрэва. Гэтаму сплаву прадстаіць вялікая будучыня, калі ён і за ўсіх іншых адносінах будзе здавальняючым.

Аўтамабільная дарога ў 20.000 кілёмэтраў.

У Амэрыцы абмяркоўваецца пытаньне аб пракладцы вялікай аўтамабільнай дарогі, якая перасякла-б усю Амэрыку з поўначы на поўдзень.

Па гэтаму плянаванаму шляху магчыма будзе праехаць на аўтамабілі з Канады, праз Злучаныя Штаты, Мэксіку, даржаву Панамскага перашэйку, Калюмбію, Эквадор, Перу і Чылі, у Паўдзённую Аргентыну.

Усё падарожжа складае каля 20.000 кілёмэтраў і зойме, пры 6-8 гадзінах штодзённай язды, некалькі тыдняў і, разумецца, будзе даступна нямногім: як відома, паездка на аўтамабілі каштуе значна даражэй, чымся на чыгунцы, або параходзе.

ЖЫВЁЛІНА Ў 240 МЭТРАЎ ДАЎЖЫНІ.

Відомы вандроўца Эндрус знайшоў у пустыні Гобі (Цэнтральная Азія) косьці агромаднай дагістарычнай жывёліны, якая жыла, па думцы вучоных, некалькі сот тысяч гадоў таму назад. Даўжыня тулава жывёліны—240 мэтраў, яе крок дасягае 40 мэтраў.

ГРАМАФОН-ЛІЛІПУТ.

У кааперацыйных крамах у Ленінградзе зьявілася арыгінальная новіна—кішэньныя грамафоны. Гэтыя грамафоны атрыманы са Швэцыі. Грамафон-ліліпут складваецца і свабодна зьмяшчаецца ў кішэні пальто. Ён вельмі гучны, каштуе 40 руб.

Што слухаць па радыё.

Нядзеля, 31-га сакавіка.

10-00—Сялянская радыёгазэта з антырэлігійнай старонкай.
11-20—Сялянскі канцэрт.
12-20—Сьвяцкае разам з намі.
12-45—Радыёматар з адказамі на тэхнічныя запытаньні.
13-25—Выступленьне рабочых гуртноў.
17-00—Час піянэра і вучня.
18-00—Камсамольская газэта «Чырвоная Зьмена» па радыё.
18:30—Лекцыя рабоча-сялянскага радыё унівэрсытэту (падрыхтоўчага курсу) па прыродазнаўству.
19-20—Літаратурна-музычны журнал.
20-30—Канцэрт.

Панядзелак 1 сакавіка.

17-40—Пасьля абедзенны канцэрт (струн. арыкстр).
18-05—Гутарка: таварыства прыхільнікаў радыё (ТРР) тав. Крылёвіні).
18-25—Лекцыя рабоча-сялянскага радыёунівэрсітэту (падрыхтоўчага курсу).
19-25—Беларуская радыёгазэта.
20-10—Гутарка старшыні ЦК саюзу мэталістых т. Іванова.
20-35—Гутарка на літоўскай мове.
21-00—Трансляцыя.
23-00—Агляд заўтрашняй прэсы.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 1-4-29 г.

	Куп.	Прад.
1-я 6 проц. залатая выйгрышная пазыка	4—84	—
2-я 6 проц. залатая выйгрышная пазыка	5—00	—
Бясп. пазыка 26 г.	122—25	—124—25
10-проц. дзярж. выйгрышная пазыка 27 г.	25—43	—25—53
6-я дзяр. індустрыял.	25—12,5	—25—22,5
3-я сялянская 1927 г.	5—00	— —
12-проц. рэнта. 1927 г.	104—00	— —
2-я пазыка індустрыял. проц. вып.	26—30	—26—40.
2-я індустрыял. бясп. проц.	25—92	—26—02.
11 унутран.	100—91	—100 —96

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— У панядзелак, 1 сакавіка, а 7 гадзіне увеч. адбудзецца сход асьветкаў-аўтораў.

Парадак дня:

Інструкцыйны даклад т. Ашаровіча аб антырэлігійнай кампаніі.

— Сёньня, а 6 г. увеч.—лекцыя маскоўскага педагога Шульгіна—«Навейшыя даследаваньні савецкай педагогікі». Білеты ад Гр. і МК.

А 5 г. увечары пасяджэньне фракцыі праўленьня.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

У аўторак, 2 красавіка, а 7 гадз. увеч., у клюбе друкароў (Ленінская вул.)

АДБУДЗЕЦЦА АДЧЫНЕНЫ СХОД

ячэйкі КП(б)Б Белдзяржыдавецтва і радакцый газэт: «Савецкая Беларусь», «Беларуская Вёска», «Аблёбр», Выд-ва і рэд. «Чырвонай Зьмены», Кантор. „Известия“ і „Гиз“ РСФСР.

НА ПАВЕСТКЫ ДНЮ:

„5-ці гадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі БССР на падставе дакладу тав. Галадзеда і рэзалюцыі XII зьезду КП(б)Б“—дакладчык—прадстаўнік Дзя